

ЛЯПНУЦЬ ДЗВЯРЫМА ПРОСТА...

Сямейная газета

КОЛЬКІ ГРОШАЙ ТРЭБА НА ВЯСЕЛЛЕ?

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛІСТАПАДА 2022 г. ЧАЦВЕР № 221 (29843)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАРТУН, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Як вядома, пастановай урада № 713 было ўведзена рэгуляванне цэн на тавары спажывецкай карзіны. Бізнес перабудоўваецца на работу ў новых умовах. Што датычыцца асартыменту тавараў, месцамі ўзнікаюць пэўныя складанасці. Сістэмнай прычыны тут няма, у кожнага яна свая. Камусьці спатрэбіўся час, каб перабудавацца. Напрыклад, у нехарчовым сегменце ў адной з буйных гандлёвых сетак быў па пэўных пазіцыях бедны асартымент. Прычына ў тым, што суб'ект гаспадарання не паспеў пераацаніць некаторыя пазіцыі. Як толькі пераацэнка завяршаецца, са склада паступаюць тавары, запас там на 3-4 месяцы. Ідзе работа над тым, каб асартымент ва ўсіх магазінах не скарачаўся і суб'екты гаспадарання хутчэй адаптаваліся да новай сістэмы рэгулявання цэн. Мы праводзім тут комплексную растлумачальную работу».*

# ВОЛАТ У РЫШТАВАННЯХ




Самы вядомы зубр Беларусі, несумненна, — гэты, які «пасяліўся» ў Баранавіцкім раёне на мяжы Брэсцкай і Мінскай абласцей. Масіўны сілуэт сімвала нашай краіны сустракае кожнага, хто едзе па трасе «Брэст — Масква», ужо амаль дваццаць гадоў. Да гэтага юбілею скульптуру вырашана абнавіць, таму зараз яна стаіць у рыштаваннях. Мяркуецца замацаваць бетонную аснову, аднавіць зварачныя швы. Зубра таксама наноў пафарбуюць і ўстановяць на ім падсвечванне. Паколькі работы на масіўнай скульптуры праводзяцца на вялікай вышыні, іх выконваюць прафесійныя прамысловыя альпіністы. Адзін з іх, Вячаслаў ЧЫЛЬ, — на гэтым фота.

**Фота БелТА.**

## КОРАТКА

• **Адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі пытанні пасяджэння АДКБ, беларуска-расійскія адносіны з акцэнтам на гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, а таксама графік сустрэч да канца гэтага года.**

• У Гомельскай вобласці ў наступным годзе плануюць увесці 11 МТФ.

ISSN 1990 — 763X

22221>

9 771990 763008

Свая справа

# ГАНДЛЁВАЯ ДЫНАСТЫЯ ШУХТО

**Развіццё сямейнага бізнесу ў невялікім населеным пункце — міф або рэальнасць? Мы пагаварылі з Аляксандрам Шухто з Багушэўска, які стварыў у гарадскім пасёлку цэлы гандлёвы комплекс, пра ўзлёты і падзенні прадпрымальніцтва і нялёгкі шлях да мары.**



**Аляксандр ШУХТО з сынамі Аляксеем і Яўгенам.**

СТАР. 4

Жыллёвае пытанне

# Ужо ў снежні «індывідуалам» будавацца стане прасцей, лягчэй і хутчэй

## Указ кіраўніка дзяржавы № 202 «Аб спрошчаным парадку ўзвядзення і рэканструкцыі аб'ектаў будаўніцтва» ўступае ў сілу ўжо праз месяц



**Развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў будаўніцтва жылля, таму што кожны год яго ўзводзіцца досыць шмат. Як адзначыла намеснік начальніка аддзела рэгулявання жыллёвай палітыкі ўпраўлення жыллёвай палітыкі Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Кацярына АРЦЮХ, дырэктывай кіраўніка дзяржавы № 8 «Аб прыярытэтных кірунках развіцця будаўнічай галіны» даручана забяспечыць будаўніцтва індывідуальнага жылля ў памеры не менш за 40 % ад агульнага аб'ёму жылля.**

СТАР. 3

# ПАМЯТАЦЬ МІНУЛАЕ ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

**Учора ў Заслонаўскай сярэдняй школе Лепельскага раёна праходзіла надзвычай цікавае мерапрыемства, якое надоўга запомніцца і вучням, і настаўнікам. Дыялогавую пляцоўку ў вясковай школе наведалі вышэйшыя службовыя асобы краіны — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА і міністр абароны Віктар ХРЭНІН.**



Фота БелТА.

У школе высокіх гасцей сустракалі паказам творчых нумароў, адзін з якіх не пакінуў абыякавым нікога з прысутных. Дзеці стварылі своеасаблівую фотахроніку забыцця і зневажання замежнымі краінамі сваёй гісторыі, паказаўшы здымкі разбураных нядаўна помнікаў савецкім воінам-вызваліцелям — у Польшчы, Літве, Чэхіі. Спробу Захадам перапісаць мінулае беларусы лічаць кашчунскай, і дзеці, якія жывуць у вёсцы, дзе дыслацыруецца воінская часць, з болем успрымаюць такое стаўленне да подзвігаў сваіх продкаў.

«Мы ўбачылі, на якім кантрасце адбываюцца падзеі ў нас і за мяжой. Пачынаецца ўсё са злому помнікаў, забыцця памяці тых людзей, якія аддалі жыццё за вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тых краін, аб якіх гаварылася са сцэны. Перапісваецца гісторыя, прыходзяць на змену пакаленні і, здавалася б, зусім па-іншаму ўспрымаецца тое, што адбывалася 80 гадоў таму. Але мы той памяці проціпастаўляем сваю памяць, якая захоўваецца і ў Лепельскім раёне ў памяці сем'яў. Гэту памяць мы пранясём праз гады і перададзім сваім дзецям і ўнукам. Невыпадкова наша сустрэча праходзіць у Год гістарычнай памяці. У Лепельскім раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны разгарнуўся магутны партызанскі рух. У вас, тых, хто жыве ў гэтым ваенным гарадку, у Заслонаве, ёсць унікальная магчымасць дакрануцца да гэтай гісторыі, якая звязана са станаўленнем і развіццём праслаўленага армейскага злучэння — 19-й асобнай гвардзейскай механізаванай Нікалаеўска-Будапешцкай Чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені брыгады. Яна, з'яўляючыся яшчэ дывізіяй, ваявала пад Масквой, Курскам, вызваляла ад фашысцкай чумы Украіну, Цэнтральную Еўропу, затым выконвала свой воінскі абавязак на тэрыторыі Венгрыі. І сёння воіны брыгады з гонарам выконваюць свой воінскі абавязак па абароне нашай краіны, умацаванні абараназдольнасці Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

Міністр абароны Віктар Хрэнін, расказаў, што ў гэтым годзе брыгада была прызнана найлепшай у краіне, і Ігар Сергеенка адзначыў, што гэта заслуга ў тым ліку і жыхароў Заслонава, якія забяспечваюць надзейны тыл для абаронцаў Радзімы.

У час круглага стала госці паразмаўлялі з дзецьмі, даведаліся, чым тыя ганарацца ў сваёй краіне, якія прафесіі хочуць выбраць і ці збіраюцца вярнуцца пасля атрымання вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі на малую радзіму. Заслонаўскія школьнікі падзяліліся, што пачуццё гонару ў іх ёсць за прадпрыемствы, людзей, родную прыроду, якую яны стараюцца берагчы і захоўваць, і пасля атрымання дыплома многія плануюць жыць і працаваць у Заслонаве або ў Лепельскім раёне. У сваю чаргу Ігар Сергеенка адзначыў, што ў яго выклікае радасць, калі разам атрымліваецца дапамагчы такім вясковым школам палепшыць матэрыяльную базу, а таксама вырашыць жыццёвыя пытанні тых, хто звяртаецца да прадстаўнікоў улады на асабістых прыёмах і прамых тэлефонных лініях.

**Паводле БелТА.**

Парламенцкі дзённік

# Ад паставак сыравіны да збыту

**Практыку прымянення заканадаўства ў сферы знешнеэканамічнай дзейнасці і вытворчасць ва ўмовах заходніх санкцый на прыкладзе работы прадпрыемстваў Гомельскай вобласці прааналізавалі дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах. Парламентарыі правялі выязное пасяджэнне на тэрыторыі Мазырскага раёна.**

## Піламатэрыялы для Кітая

Важна зразумець, як ва ўмовах санкцыйнага ціску адчувае сябе рэальны сектар эканомікі, якія бар'еры ёсць у айчынных вытворцаў для нармальнага функцыянавання, выпрацаваць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства для супрацьдзеяння заходнім санкцыям. Асноўныя задачы выязнога пасяджэння парламентарыяў акрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Андрэй САВІНЫХ.**

Першым аб'ектам рабочага візіту стаў Мазырскі доследны лясгас. Два гады таму на прадпрыемстве была адкрыта новая вытворчасць — завод па выпуску пелет, пабудаваны за ўласныя і крэдытныя сродкі. Узвялі новую вытворчасць у рэкордныя тэрміны. Каб не было праблем з адгрузкай, пабудавалі тупіковую чыгуначную лінію. Амаль уся прадукцыя завода — гадавая магутнасць яе — 36 тысяч тон паліўных гранул — ішла на экспарт.

— Мы пераарыентаваліся на Расію, Кітай, Азербайджан. Прапрацоўваем шляхі паставак ва Узбекістан. Прадукцыя наша запатрабаваная і абавязкова знойдзе свайго пакупніка, — не сумняваецца **дырэктар Мазырскага доследнага лясгаса Аляксандр ЦІТОК.**

У сувязі з санкцыямі прыйшлося значна перагледзець лагістыку паставак прадукцыі. У выніку — кантракты на піламатэрыялы і пелеты для расійскага рынку, з якім раней па такіх пазіцыях мазыране не працавалі.

Піламатэрыялы з Мазыра актыўна пачаў купляць і Кітай. На дадзеную краіну прыходзіцца 40 % ад усяго аб'ёму экспартных паставак прадпрыемства. Сёння Мазырскі доследны лясгас актыўна прапрацоўвае магчымасць супрацоўніцтва з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу. У планах — вытворчасць каркаснага жылля.

— Санкцыі ў нас у галовах, — упэўнены кіраўнік лясгаса. — Спыняцца нельга. Нават пры закупцы тэхнікі сёння ёсць выбар сярод айчынных вытворцаў. Гэта сведчыць аб дальнабачнасці палітыкі кіраўніка дзяржавы па падтрымцы ўласнай вытворчасці.

## Гістарычны момант для нафтавікоў

Яшчэ адным пунктам візіту парламентарыяў у рэгіён стаў Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. На прадпрыемстве цяпер рэалізуецца найбуйнейшы і найважнейшы для ўсёй краіны інвестыцыйны праект — будаўніцтва комплексу па гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэшткаў. Прыезд дэпутатаў супаў з гістарычным момантам у жыцці мазырскіх нафтавікоў — стартам першых пускавых аперацый на новым комплексе. Гэта дзявяты падобны аб'ект у свеце і сапраўдны працоўны подзвіг калектыву — так ахарактарызаваў праект генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» Віталь Паўлаў.

Акрамя стварэння 430 рабочых месцаў, новы комплекс дазволіць павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафты да 90 %, а таксама значна павялічыць выпуск дызельнага паліва.



## Куды едзе «малочка»

Курс на пераадоленне складанасцяў, звязаных з санкцыямі, і далейшае развіццё ўзяло і камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Мазырскія малочныя прадукты». «Малочка» адсюль пастаўляецца на рынкі 37 краін. Асноўны экспартны партнёр — Расійская Федэрацыя. Але мазыран добра ведаюць і спажыўцы на азіяцкім рынку, а таксама ў Казахстане, Грузіі і Азербайджане. Сёлета партыі мазырскай прадукцыі адправілі ў Сінгапур. Самы запатрабаваны экспартны прадукт — сухое малако. Тут яго выпускаюць 10 тон у суткі.

На прадпрыемстве працягваецца тэхнічнае перааснашчэнне па трох асноўных напрамках: участкі натуральнамалочнай прадукцыі, перапрацоўкі вяршкоў і інжынерных сістэм прадпрыемства.

## Каб вырашыць праблему, яе трэба сфармуляваць

Вынікі рабочага візіту на Гомельшчыну члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах падвялі на сустрэчы з кіраўніцтвам Мазырскага райвыканкама. Як было адзначана, штогод на тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў раёна інвестуецца каля 450 мільёнаў рублёў. З пачатку года на Мазыршчыне створана 40 новых прадпрыемстваў, 12 з іх — у вытворчай сферы.

Фокус дзяржаўнага кіравання павінен быць скіраваны на падтрымку вытворцаў, выказаў сваё меркаванне старшыня Пастаяннай камісіі Андрэй Савіных. На яго думку, парламентарыі могуць дапамагчы на заканадаўчым узроўні вырашыць праблемы, якія перашкаджаюць прадпрыемствам развівацца ва ўмовах санкцыйнага ціску, пры актыўным дыялогу вытворцаў з урадам і выканаўчымі ўладамі.

— Сёння мы жывём у вельмі складаны час, калі глабальная эканоміка саступае месца рэгіяналізацыі, свет пераходзіць у фармат існавання макрарэгіёнаў. Гэта будзе азначаць стварэнне новых тэхналагічных звёнаў, таму вельмі важна працаваць над стварэннем тэхналагічных зон, кластараў, якія будуць поўнасцю забяспечваць дзейнасць айчынных прадпрыемстваў, пачынаючы ад паставак сыравіны, камплектуючых да збыту і тэхналагічных рашэнняў. Не ўсе пытанні можна вырашыць адразу, але гэта тэндэнцыя, якую мы павінны заахвочваць, падтрымліваць і на заканадаўчым узроўні, і на ўзроўні фінансавання, — падкрэсліў Андрэй Савіных.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Краіны актыўна нарошчваюць запасы золата



Некаторыя краіны, у тым ліку Кітай і Расія, пачалі актыўна купляць золата на фоне жорсткага валютнага дамінавання Злучаных Штатаў. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле аглядальніка Bloomberg Дэвіда Фіклінга, паведаміла ТАСС. У матэрыяле адзначаецца, што ў ліпені—верасні краіны закупілі каля 400 тон золата. «Гэта рэкордны прырост, які можна параўнаць з тым, што яны набылі б за цэлы год у звычайны час», — адзначыў Фіклінг. Журналіст параўнаў спробы краін нарасціць запасы золата з падрыхтоўкай да «зомбі-апакаліпсіса». Акрамя Кітая і Расіі, золата таксама актыўна скупляюць Турцыя, Індыя, Саудаўская Аравія, Егіпет і Ірак. Некаторыя краіны імкнуцца да нарошчвання сваіх запасаў каштоўнага металу на фоне пагаршэння ўзаемаадносін са Злучанымі Штатамі. «Цяпер перспектывы міжнародных адносін больш нявызначаныя, чым у апошнія дзесяцігоддзі. У такім святле мае сэнс тое, каб рэзервы цэнтральных банкаў не былі занадта звязаныя з якой-небудзь адной краінай», — лічыць Фіклінг. Ён таксама адзначыў, што доля амерыканскага долара ў рэзервах цэнтрабанкаў цяпер хутка зніжаецца.

## Амаль палова дзяржаў ЕС сутыкнецца налета з рэцэсіяй



У будучым годзе з рэцэсіяй у эканоміцы сутыкнецца амаль палова дзяржаў, якія ўваходзяць у Еўрасаюз. Такі прагноз зрабіла кіраўнік МВФ Крысталіна Георгіева. Паводле яе слоў, 2023 год у эканамічным плане будзе дастаткова цяжкім. З запаволеннем росту могуць сутыкнуцца ЕС, ЗША і Кітай. У цэлым глабальны рост эканомікі налета прагназуецца на ўзроўні 2,7 працэнта. Гэта даволі нізкі паказчык, адзначыла Георгіева. Краінам свету давядзецца пераадольваць высокую інфляцыю, якая будзе перашкаджаць развіццю эканомікі і стане цяжарам для людзей з невысокімі даходамі.

## Удзельнік латарэі ў ЗША выйграў больш чым два мільярды долараў




У ЗША ўдзельнік латарэі Powerball уварваў джэкпот у памеры $2,04 млрд. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на выданне Los Angeles Times. Імя шчаслівчыка пакуль невядомае. Таксама не называецца колькасць білетаў, якія выйгралі. Магчыма, пераможцаў будзе некалькі. У такім выпадку, згодна з правіламі латарэі, прызавы фонд будзе падзелены на роўныя долі. Адзначаецца, што мінулым разам рэкорд Powerball быў устаноўлены шэсць гадоў таму. Тады трое ўдзельнікаў латарэі падзялілі паміж сабой прызавы фонд у $1,586 млрд.

# Ужо ў снежні «індывідуалам» будавацца стане прасцей, лягчэй і хутчэй

**Дырэктыва Прэзідэнта выконваецца**

Паводле слоў спецыяліста, летась было ўведзена ў эксплуатацыю 11 тысяч 105 індывідуальных жылых дамоў, агульнай плошчай 1 931,3 тысячы квадратных метраў, што складае 44 % ад агульнай плошчы жылых дамоў, якія былі пабудаваны. На думку Кацярыны Арцюх, гэты факт пацвярджае запатрабаванасць менавіта такога віду будаўніцтва. У доказ сваіх слоў яна прывяла інфармацыю, згодна з якой у 2020 годзе было ўведзена ў эксплуатацыю 10 тысяч 23 індывідуальныя дамы, агульная плошча якіх складае 1 748,9 тысячы квадратных метраў.

Лідарамі па будаўніцтве індывідуальнага жылля па выніках 2021 года сталі: Мінская вобласць, дзе было ўведзена 865,3 тысячы квадратных метраў, Брэсцкая вобласць (335,3 тысячы квадратных метраў) і Гомельская вобласць (232,8 тысячы квадратных метраў).

Згодна з мэтавым заданнем на гэты год, галіне неабходна забяспечыць агульны аб'ём уводу жылля ў памеры 4 мільёнаў 200 тысяч квадратных метраў, з іх з дзяржпадтрымкай — 1 мільён 200 тысяч «квадратаў». Эксперты міністэрства разлічваюць, што ў гэтым годзе будзе пабудавана не менш чым 1 мільён 680 тысяч квадратных метраў жылля дамоў у індывідуальным выкананні.

Папярэднія вынікі паказваюць, што мэтавае заданне будзе выканана. Фактычна за 9 месяцаў гэтага года было пабудавана і ўведзена 7289 індывідуальных жылых дамоў агульнай плошчай 1 мільён 280,4 тысячы квадратных метраў, што складае 44,4 % ад агульнай плошчы жылых дамоў, якія былі ўведзены ў эксплуатацыю.

Намеснік начальнік аддзела адзначыла, што па выніках дзевяці месяцаў лідарамі стала Мінская вобласць, дзе пабудавана 524,7 тысячы квадратных метраў (41 % ад агульнага аб'ёму ўводу ў эксплуатацыю індывідуальных жылых дамоў па краіне). Другое месца трымае Брэсцкая вобласць (244 тысячы квадратных метраў, або 19,1 %).

**Доўгатэрміновыя планы залежаць ад фінансавання**

На думку Кацярыны Арцюх, у наступным годзе запланавана ўзвядзенне не менш як 1 мільён 720 тысяч квадратных метраў жылля ў індывідуальным выкананні. Такія паказчыкі па «індывідуалах» атрымліваюцца, зыходзячы з запланаванага задання на ўзроўні 4 мільёнаў 300 тысяч квадратных метраў агульнага ўводу жылля згодна з дзяржаўнай праграмай «Будаўніцтва жылля на 2021—2025 гады». Паводле гэтага дакумента, за пяцігодку плануецца пабудаваць 21,4 мільёна квадратных метраў жылля ў цэлым, з іх толькі індывідуальнага — не менш за 8,9 мільёна квадратных метраў.

Варта заўважыць, што найбольш запатрабаваныя ўчасткі размешчаны паблізу вялікіх і сярэдніх населеных пунктаў. Акрамя таго, істотны попыт назіраецца на зямельныя ўчасткі, якія забяспечаны мінімальна неабходнай інфраструктурай. А для гэтага патрэбны грошы.

Для фінансавання будаўніцтва аб'ектаў неабходнай інфраструктуры да шматкватэрных і індывідуальных жылых дамоў сёлета прадугледжана выдзяленне з рэспубліканскага бюджэту 882,35 мільёна рублёў, а з мясцовых бюджэтаў — 209,9 мільёна рублёў. Спецыяліст адзначыла, што для фарміравання зямельных участкаў, а таксама забеспячэння ўмоў праектавання і будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў, у тым ліку з канструкцый індустрыяльнага домабудавання, аблвыканкамамі зацверджаны рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў па індывідуальным жыллёвым будаўніцтве.

**Комплексная забудова**

Кацярына Арцюх лічыць, што індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ажыццяўляецца двума спосабамі: самастойна жыхарамі населеных пунктаў і дзяржаўнымі заказчыкамі. Як паказвае практыка, грамадзяне аддаюць перавагу самастойна выступаць заказчыкамі па будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў і заказваюць у падрадных арганізацый толькі асобныя віды работ.

А на самай справе комплексную індывідуальную забудову пераважна ажыццяўляць адным забудоўшчыкам, у тым ліку для ўпарадкавання і паляпшэння архітэктурнага аблічча населеных пунктаў. Пры гэтым заканадаўствам урэгуляваны пытанні, якія дазваляюць ажыццяўляць будаўніцтва комплекснай індывідуальнай жылой забудовы шляхам заключэння дагавораў долевага будаўніцтва з грамадзянамі. Фізічным асобам на такое будаўніцтва можа аказвацца дзяржаўная падтрымка. Яна можа быць у выглядзе льготнага крэдыту або адраснай субсідыі.

**Пашпарт забудоўшчыка зробяць за месяц**

Як вядома, з 15 снежня ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта № 202, пасля чаго будзе істотна спрошчаны парадак узвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў. Распрацоўшчыкі гэтага дакумента ўпэўненыя, што механізм, прадугледжаны Указам № 202, карэнным чынам спросціць падыходы да арганізацыі будаўнічага працэсу — будзе амаль цалкам выключаная неабходнасць у зборы рознага роду дакументаў.

Указам прадугледжана, што ў выпадку ўзвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў або нежылых капітальных пабудоў пятага класа складанасці на зямельным участку, які быў аддадзены для будаўніцтва жылога дома, можна будзе пабудаваць такія аб'екты без атрымання дазвольнай дакументацыі (дазволу на рэканструкцыю), без распрацоўкі праектнай дакументацыі і ўзгаднення яе з мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, без прыёмкі іх у эксплуатацыю. Велізарны стос дакументаў самастойна падрыхтоўваць ужо не трэба.

Для будаўніцтва або рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў у сельскіх населеных пунктах (за выключэннем размешчаных на тэрыторыі раёнаў, якія прылягаюць да абласных цэнтраў і сталіцы), пасёлках гарадскога тыпу і гарадах (за выключэннем Мінска) грамадзянам дастаткова мець дакумент, які сведчыць правы на зямельны ўчастак.

Для ўзвядзення такіх пабудоў у сельскіх населеных пунктах, якія размешчаны на тэрыторыі раёнаў побач з абласнымі цэнтрамі, у пасёлках гарадскога тыпу і гарадах (за выключэннем Мінска) грамадзяніну неабходна будзе атрымаць пашпарт забудоўшчыка. Характэрна, што на падставе такога пашпарта змогуць пабудаваць жылыя аднакватэрныя дамы таксама і юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі.

Выдача пашпарта забудоўшчыка будзе ажыццяўляцца па прынцыпе «адно акно», тэрмін афармлення такога дакумента — адзін месяц, кошт — 25 базавых велічынь.

Між іншым, па словах намесніка начальніка аддзела, і пасля 15 снежня будзе дзейнічаць паралельна новаму парадку стары парадак узвядзення і рэканструкцыі гэтых пабудоў (з атрыманнем усіх дазволаў, узгадненняў, заключэнняў і распрацоўкай праектнай дакументацыі).

Кацярына Арцюх лічыць, што ў перспектыве асноўным рухавіком развіцця галіны павінна стаць індывідуальнае і малапавярховае жыллёвае будаўніцтва. Само будаўніцтва мае патрэбу ў падтрымцы з боку прамысловасці мясцовых будаўнічых матэрыялаў, лясной індустрыі і драўлянага домабудавання.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Падзея

# ЧАМУ ВАРТА ПАБЫВАЦЬ НА «ПРАДЭКСПА-2022»?

**Звыш 100 экспанентаў возьме ўдзел у Міжнароднай спецыялізаванай выставе-кірмашы «Прадэкспа-2022». Яны прадставяць свае дасягненні, тэхналогіі і новыя ўзоры прадукцыі. Найбуйнейшы ў Беларусі форум лідараў айчыннага і замежнага харчовага рынку будзе праходзіць з 15 да 18 лістапада і пройдзе ў Мінску ў 28-ы раз.**

— За многія гады выстава «Прадэкспа» зарэкамендавала сябе як эфектыўная дыялогавая пляцоўка, — падкрэсліў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Вадзім ШАГОЙКА**. — У прадстаўнікоў прадпрыемстваў і гандлёвых сетак будзе магчымасць заключыць кантракты і дамоўленасці, — адзначыў ён.

Беларусам ёсць што паказаць і спажыўцам — наведвальнікам выставы, якая традыцыйна збірае мноства гледачоў, і калегам з іншых краін. Вадзім Шагойка падкрэсліў, што развіццё сельскай гаспадаркі ў Беларусі знаходзіцца на высокім узроўні і мае штогадовы прырост.

— Удасканальваюцца тэхналогіі і пашыраецца асартымент выпусканай прадукцыі. Яна вырабляецца са значным запасам (экспартным патэнцыялам) і з'яўляецца экспартна арыентаванай, — сказаў намеснік міністра сельскай гаспадаркі. — Яна карыстаецца папулярнасцю і попытам у замежных краінах дзякуючы сваёй якасці.

У рамках выставы прадугледжаны шэраг бізнес-сустрэч і перагавораў вытворцаў і прадстаўнікоў гандлёвых сетак: будзе магчымасць азнаёміцца з прадукцыяй і падпісаць дагаворы. Вялікую ўвагу арганізатары аддаюць дзелавому форуму, на якім будуць разглядацца пытанні спажывецкага рынку, імпартазамяшчэння і ў цэлым харчовай бяспекі краіны. І, вядома ж, удзельнікаў чакаюць конкурсы прафесійнага майстэрства прадстаўнікоў харчовай галіны, дэгустацыі і прэзентацыі. Усе яны накіраваны ў першую чаргу на папулярызацыю і прасоўванне айчынных брэндаў, адзначыў Вадзім Шагойка.

**Дэгустацыі на любы густ**

Штогод удзельнічаюць у «Прадэкспа» прадпрыемствы канцэрна «Белдзяржхарчпрам». Сёлета наведвальнікам і ўдзельнікам выставы свае дасягненні прадэманструюць 10 прадпрыемстваў канцэрна, расказаў **начальнік упраўлення каардынацыі і паставак тавараў на ўнутраны рынак і знешнегандлёвай дзейнасці канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ігар ГРУЦО**. Яны прадставяць беларускую кандытарскую, цукровую, алейна-тлушчавую і солевую галіны. Традыцыйна шырокі асартымент кандытарскіх вырабаў для дэгустацыі. Дарэчы, у наведвальнікаў будзе магчымасць набыць прадукцыю фабрыкі «Камунарка».

— Эфектыўнасць пляцоўкі «Прадэкспа» распаўсюджваецца не толькі на ўнутраны, але і на знешнія рынкі, — падкрэсліў Ігар Груцо. — Удзельнікі змогуць правесці перагаворы з расійскімі гандлёвымі сеткамі (а гэты рынак выступае ключавым для канцэрна). У выніку разлічваем атрымаць новыя кантракты і новыя заяўкі ў рамках ужо дзеючых дамоўленасцяў і пагадненняў.

Гаворачы аб значнасці маючага адбыцца форуму, ён адзначыў, што менавіта на «Прадэкспа» ў 2020 годзе былі зроблены першыя крокі па папулярызацыі рапсавага алею.

— Крыху больш за два гады таму канцэрн «Белдзяржхарчпрам» выступіў ініцыятарам і распачаў рэалізацыю праекта па папулярызацыі рапсавага алею ў Беларусі. Адны з першых крокаў у дадзеным кірунку былі зроблены менавіта на пляцоўцы Міжнароднай спецыялізаванай харчовай выставы-кірмашу «Прадэкспа». З тых часоў актыўная рэкламная кампанія спрыяла значнаму росту рэалізацыі рапсавага алею ўнутры краіны. Паводле апошніх даных, за 10 месяцаў 2022-га аб'ём рэалізацыі гэтага прадукту ў Беларусі вырас у паўтара раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Калі параўноўваць з 2020 годам, рост — больш чым у 10 разоў.

Шырокі спектр прадукцыі прадэманструе на «Прадэкспа-2022» і «Белкаапсаюз».

— Стэнд «Белкаапсаюза» прадставіць прадукцыю ўсіх абласцей Рэспублікі Беларусь, — расказаў **намеснік старшыні праўлення «Белкаапсаюза» Валерый МАРЫНІЧАЎ**. — У першую чаргу — нашы навінкі, якія распрацаваны і ўкаранёны ў вытворчасць за апошні год.

Сёння больш за 300 вытворчых прадпрыемстваў, цэхаў, участкаў спажывецкай кааперацыі Беларусі займаецца вытворчасцю харчовай прадукцыі (хлебапячэнне, мясная перапрацоўка, рыбныя вырабы, ягады шокавага замарожвання і г. д).

— Традыцыйна мы прапануем для дэгустацыі сала розных відаў. На стэндзе «Белкаапсаюза» будзе каля 70 найменняў мясной прадукцыі, а таксама квашанні, саленні і мачэнні — гэта наш брэнд, — сказаў ён.

«Прадэкспа» дае магчымасць пагутарыць са спецыялістамі, якія займаюцца аналагічнымі вытворчасцямі ў нашай краіне і за яе межамі, адзначыў Валерый Марынічаў.

— І, вядома, хацелася б заключыць кантракты з Расійскай Федэрацыяй, тым больш што на выставе будуць прысутнічаць прадстаўнікі розных гандлёвых сетак.

**Дзелавая праграма і майстар-класы**

Сёлета арганізатары «Прадэкспа» ставілі перад сабой задачу прыцягнуць не толькі «хатні рынак», але і прадстаўнікоў гандлёвых сетак, якія для беларускіх вытворцаў з'яўляюцца знешнімі. Прынцып запрашэння сетак — іх закупачная магутнасць, расказалі арганізатары выставы.

— Наш асаблівы гонар — дзелавая праграма выставы, дзелавы форум і конкурсы прафесійнага майстэрства, — расказала **начальнік упраўлення выставаў і кірмашоў НВЦ «БелЭкспа» Вікторыя АГАФОНАВА.**

У рамках выставы пройдзе сесія B2B-перагавораў паміж вытворцамі харчовай прадукцыі, пастаўшчыкамі і рытэйлам.

— Экспаненты выставы «БелЭкспа» атрымаюць унікальную магчымасць пазнаёміцца з прадстаўнікамі камерцыйных службаў гандлёвых сетак у такой колькасці — гэта і Беларусь, і Расія, а таксама Казахстан, Кыргызстан, Узбекістан, — адзначыла Вікторыя Агафонава. Усяго ў выставе возьмуць удзел 35 буйных гандлёвых сетак, паведаміла яна.

«Прадэкспа-2022» збярэ на сваіх экспазіцыйных плошчах значную колькасць расійскіх прадпрыемстваў: пра навінкі сваёй харчовай прамысловасці заявяць і правядуць дэгустацыі сем абласцей Расійскай Федэрацыі (у тым ліку Разанская, Пскоўская, Башкартастан).

Упрыгажэннем выставы стануць конкурсы прафесійнага майстэрства. Адкрыты чэмпіянат пекараў збярэ флагманаў хлебапячэння, якія будуць спаборнічаць у чатырох намінацыях па сусветных правілах. Адбудзецца Міжнародны чэмпіянат кандытарскага мастацтва і Кулінарны кубак. Майстар-класы правядуць для ўсіх жадаючых знакамітыя шэф-кухары з Беларусі і Расіі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Блізкая ўлада

# «ЛЕНІНСКІ РАЁН: ДЛЯ ЖЫЦЦЯ, ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

**Менавіта так гучыць раённы дэвіз. І сапраўды, на яго тэрыторыі нямала важных аб'ектаў, цікавых і прыгожых мясцін. Падрабязней аб гэтай сталічнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы карэспандэнту «Звязды» расказаў кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска Раман МЕЛЬНІК.**



***— Раман Іванавіч! У гімне Ленінскага раёна дадзенае муніцыпальнае ўтварэнне названа «сэрцам сталіцы». А што паслужыла падставай для такога вызначэння? Чым ён адрозніваецца ад іншых раёнаў горада?***

— Ленінскі раён цягнецца ад самага цэнтра да поўдня сталіцы і мяжуе з найбольшай колькасцю іншых гарадскіх раёнаў, дакладней кажучы, — пяццю: Цэнтральным, Партызанскім, Заводскім, Маскоўскім і Кастрычніцкім. Значная частка раёна размешчана ў гістарычным цэнтры сталіцы і ўключае вялікую колькасць архітэктурных помнікаў, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Тут размешчана некалькі найважнейшых для Мінска і ўсёй краіны адміністрацыйных, культурных і спартыўных аб'ектаў: Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі, Нацыянальны банк, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства прамысловасці, Галоўпаштамт, Купалаўскі тэатр, Нацыянальны гістарычны і Нацыянальны мастацкі музеі, стадыён «Дынама» і іншыя.

Ленінскі раён сталіцы стаў цэнтрам прыцягнення аб'ектаў культуры рэспубліканскага значэння. Гэта Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны тэатр Я. Купалы. Акрамя таго, тут размешчаны ўстановы культуры, якія знаходзяцца ў веданні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь: Цэнтральны Дом афіцэраў ВС РБ і Драматычны тэатр Беларускай Арміі.

Сапраўдны скарб Ленінскага раёна — паркі і скверы. Большасць зялёных зон сканцэнтравана ў Серабранцы і Лошыцы, але і ў цэнтры Мінска на адміністрацыйнай тэрыторыі раёна нямала зацішных куткоў, дзе можна адпачыць ад шуму горада ў цені дрэў. На тэрыторыі Ленінскага раёна, насупраць Кастрычніцкай плошчы, размешчаны адзін з самых старых сквераў Мінска. Лічыцца, што ён быў закладзены ў 1836 годзе на месцы плошчы Новага рынку. Галоўнай жа славутасцю сквера, ды і ўсяго Мінска, стаў фантан са скульптурай «Хлопчык і лебедзь». Ён быў усталяваны ў 1874-м у гонар адкрыцця гарадскога водаправода. Фантан працуе да гэтага часу, у 2016-м быў рэканструяваны — аднаўлены скульптуры жаб, з якіх б'юць струмені вады, адрамантаваны чаша і помпавае абсталяванне.

Любімым месцам адпачынку не толькі жыхароў раёна, але і ўсяго горада Мінска з'яўляецца Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс. Гэта ўнікальнае месца, у якім захаваліся сляды ўсіх эпох садова-паркавага мастацтва за ўсю гісторыю Беларусі. Тут расце больш за 36 тысяч дрэў, 16 000 кустоў, знаходзяцца руіны, больш каштоўныя за любую сучаснасць. Тры старажытныя будынкі ў Лошыцкім парку адносяцца да помнікаў прамысловай архітэктуры XIX стагоддзя.

***— Раён можна ахарактарызаваць як больш адміністрацыйны, на яго тэрыторыі размяшчаецца нямала дзяржаўных ведамстваў, устаноў, замежных пасольстваў. Але і прамысловасць прадстаўлена прадпрыемствамі, вядомымі не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Наколькі вялікі іх уклад у папаўненне гарадскога бюджэту?***

— Ленінскі раён з'яўляецца найбуйнейшым прамысловым раёнам горада Мінска, робіць значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё сталіцы, выпрацоўваючы больш як 20 працэнтаў яе прамысловай прадукцыі.

Прамысловы патэнцыял раёна прадстаўляюць 15 найбольш буйных прадпрыемстваў, якія маюць славу не толькі ў горадзе, краіне, але і за яе межамі. Сярод іх: РУП «Мінскэнерга», такія прадпрыемствы, як «Камунарка», «Мінск Крышталь», «МЗКР», «Дражджавы камбінат», «Элема», «Фідмаш», «Камволь».

Ленінскі раён з году ў год нарошчвае аб'ёмы прамысловай вытворчасці. Так, за бягучую пяцігодку раён адзначыўся паслядоўным штогадовым ростам прамысловых аб'ёмаў, не дапусціўшы адмоўнай дынамікі.

У 2021 годзе арганізацыямі раёна выпушчана прамысловай прадукцыі на суму 3,7 млрд рублёў (тэмп росту 109,4 %). У студзені—сакавіку бягучага года аб'ём прамысловай вытворчасці склаў 1,1 млрд рублёў.

Удзельная вага ў агульным аб'ёме вытворчасці арганізацый рэспубліканскай формы ўласнасці складае 94 працэнты, камунальнай формы ўласнасці — 1,4 працэнта, арганізацый, якія не маюць ведамаснай падпарадкаванасці, — 4,4 працэнта.

***— Як у раёне развіваецца сацыяльная сфера: адукацыя, ахова здароўя? Што робіцца для павышэння якасці жыцця людзей?***

— Сістэма адукацыі Ленінскага раёна г. Мінска прадстаўлена 80 установамі адукацыі: 47 установамі дашкольнай адукацыі (з іх 1 — спецыяльная для дзяцей з парушэннямі зроку № 353), 28 установамі агульнай сярэдняй адукацыі, з іх 4 гімназіі, 1 ліцэй.

За апошнія тры гады адкрыты: «Яслі-сад № 574 г. Мінска» (2020 год), ДУА «Сярэдняя школа № 224 г. Мінска» (2021 год); рэарганізавана ДУА «Яслі-сад № 374 г. Мінска» шляхам далучэння да яго ДУА «Яслі-сад № 403 г. Мінска» (2021 год).

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі навучаюцца 23 149 навучэнцаў. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі навучаецца каля 8600 выхаванцаў.

Сетка дзяржаўных устаноў аховы здароўя Ленінскага раёна прадстаўлена шасцю гарадскімі дарослымі паліклінікамі №№ 6, 7, 11, 18, 23, 37, адной дзіцячай гарадской паліклінікай № 7 і дзвюма стаматалагічнымі паліклінікамі №№ 10, 14; Гарадскім дзіцячым псіханеўралагічным дыспансерам. Стацыянарную дапамогу аказваюць установы аховы здароўя «2-я гарадская клінічная бальніца» і «3-я гарадская клінічная бальніца ім. Е. У. Клумава». Былая 2-я гарадская стаматалагічная паліклініка цяпер з'яўляецца камунальным унітарным прадпрыемствам «Клініка эстэтычнай стаматалогіі», функцыянуе на дзяржразліковай аснове.

Для стабілізацыі дэмаграфічнай сітуацыі ў раёне прадаўжаецца сацыяльна-эканамічнае развіццё аховы здароўя.

У 6-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклініцы ў снежні 2021 года завершаны капітальны рамонт з мадэрнізацыяй. Закуплена новае медыцынскае абсталяванне. Створана структурнае падраздзяленне ўльтрагукавой дыягностыкі.

На восень 2022 года запланаваны пачатак будаўніцтва дзіцячай паліклінікі магутнасцю 480 наведванняў у мікрараёне Лошыца.

Завершана працэдура падрыхтоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі для капітальнага рамонту 18-й гарадской паліклінікі, пачатак рамонту запланаваны на 2023 год.

За кошт цэнтралізаваных сродкаў Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама за 2021 год для аснашчэння амбулаторна-паліклінічных устаноў аховы здароўя Ленінскага раёна закуплена медыцынская тэхніка і абсталяванне на агульную суму 63 536 рублёў.

***— Наколькі інтэнсіўна вядзецца будаўніцтва жылля?***

— Асноўнай перспектыўнай пляцоўкай для будаўніцтва аб'ектаў, у тым ліку жылля на тэрыторыі Ленінскага раёна г. Мінска з'яўляецца жылы раён Лошыца, які будзе развівацца з улікам забудовы мікрараёнаў Лошыца-5, 7, 8, 9, 10.

У 2022 годзе на тэрыторыі Ленінскага раёна вядзецца будаўніцтва 13 жылых дамоў.

У першым квартале 2022 года забяспечаны ўвод у эксплуатацыю 4 жылых дамоў агульнай плошчай 41,6 тыс. кв. м, з іх 3 жылыя дамы для шматдзетных сем'яў агульнай плошчай 18,5 тыс. кв. м. Ключы ад новых кватэр атрымалі 248 шматдзетных сем'яў.

Да канца 2022 года плануецца завяршыць будаўніцтва і забяспечыць увод у эксплуатацыю двух жылых дамоў агульнай плошчай каля 27 тыс. кв. м.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

# ГАНДЛЁВАЯ ДЫНАСТЫЯ ШУХТО

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Аляксандра Шухто ў Сенненскім раёне Віцебскай вобласці добра ведаюць: яшчэ ў 1990-х малады прадпрымальнік пачаў развіваць сваю гандлёвую справу. Не столькі з-за жадання вялікіх грошай, колькі з-за эканамічнага крызісу ў савецкай дзяржаве, калі кожны шукаў магчымасць зарабіць. Інжынер-механік па прафесіі пачаў займацца выязным гандлем: прывозіў на сваім аўтамабілі жыхарам чатырох сельскіх Саветаў прадукты харчавання і кажаныя. Было, расказвае Аляксандр Іванавіч, нялёгка: часта з-за званкоў нядобразычліўцаў у адпаведныя кантралюючыя органы ўслед за Шухто ў вёску прыязджала міліцыя, але зачапіцца не было за што — гандаль быў афіцыйна аформлены.

Пасля, калі шмат хто пачаў вазіць па вёсках прадукты, а хтосьці і адзенне, канкурэнцыя стала высокай, і Аляксандр з жонкай Святланай загарэліся новай бізнес-ідэяй — сямейным таксі. Такой паслугі ў гарадскім пасёлку Багушэўск, у якім жывуць сужэнцы, яшчэ ніхто не ведаў. Са студзеня 2010 года чатыры аўтамабілі з жоўта-чорнымі «шашачкамі» сталі звыклым антуражам прывакзальнай плошчы гарпасёлка. З цягам часу асвоілі яшчэ адну паслугу — дастаўку неабходных прадуктаў і лекаў людзям пажылога ўзросту. Месцы кіроўцаў занялі Аляксандр, старэйшы сын Яўген і брат Святланы Сяргей, сама Святлана не толькі кіравала сямейным транспартным прадпрыемствам, але і адным з аўтамабіляў — так Шухто сталі пачынальнікамі прыватнага возніцтва ў раёне і абвергі стэрэатып пра жанчын за рулём. Нягледзячы на нізкія тарыфы, у гэтым бізнесе сям'я таксама сутыкнулася з цяжкасцямі: «перабівалі» кліентаў неафіцыйныя кіроўцы на асабістых аўто, попыт сярод жыхароў стаў зніжацца. Мо так і трэба было: уласны бізнес — выдатная школа поспеху, важна толькі выносіць з выпрабаванняў карысныя ўрокі.

Пасля доўгіх сямейных разважанняў Шухто вырашылі рухацца далей. Аляксандр Іванавіч выкупіў пусты будынак былой нарыхтоўчай канторы. Некалькі гадоў афармляў неабходныя дакументы, а пасля з сям'ёй пачаў крок за крокам будаваць, не пабаюся гэтага слова, гандлёвую імперыю, няхай сабе і мясцовага маштабу. Усё пачалося з магазіна аўтазапчастак, якога дагэтуль не было ў Багушэўску. «Вы, Аляксандр Іванавіч, першаадкрывальнікі ва ўсім», — усміхаюся я. «У гэтым жа і сэнс: зрабіць для людзей тое, чаго яшчэ няма, заслужыць аўтарытэт у насельніцтва», — адказвае спадар Шухто. Ідэя рэалізоўваць аўтазапчасткі напрошвалася сама: амаль у кожнага ёсць аўтамабіль, які час ад часу патрабуе рамонту, а да найбліжэйшага магазіна ў абласным цэнтры больш за 70 кіламетраў. Пасля з'явіўся шынамантаж, тут спатрэбілася і прафесія Аляксандра Іванавіча. Сёння ў Шухто багатая база пастаўшчыкоў, па запчасткі прыязджаюць не толькі з Сенненскага раёна, але і з Віцебска.

Потым адкрылі прадуктовую краму «Калінка», у якой сёння працуюць чатыры прадаўцы. Вялікі асартымент рыбнай і мясной прадукцыі, свежая садавіна і гароднiна, хлебабулачныя вырабы Віцебскага, Аршанскага і Вілейскага хлебазаводаў. Для аматараў салодкага і да святочных дзён на прылаўках з'яўляюцца кандытарскія вырабы гэтых жа прадпрыемстваў: тарты і піражныя. А яшчэ — гэта таксама навінка ад уладальнікаў бізнесу — па папярэднім заказе тут можна набыць свежазрэзаныя кветкі. У гарпасёлку працуе яшчэ некалькі прыватных прадуктовых магазінаў, дзве ўстановы райспажыўтаварыства, магазін «Еўраопт», але ў кожнага з іх свой сегмент спажыўцоў — па цэнах, тэрытарыяльнай блізкасці і асартыменце. Каб пагаварыць з прадаўцамі «Калінкі», мне прыйшлося адстаяць чаргу.

Яшчэ ў сям'і Шухто ёсць крама, якая рэалізоўвае будаўнічыя матэрыялы, электра- і сантэхнічнае абсталяванне, рыбалоўныя, канцылярскія і турыстычныя тавары. Ёю кіруе малодшы сын Аляксей. Вялікую ўвагу магазіны аддаюць рэкламе праз месенджары: у кожнага гаглдёвага аб'екта ёсць свая група ў Viber, дзе мясцовае насельніцтва інфармуюць пра акцыі і зніжкі, новыя паступленні, і гэты маркетынгавы ход аказаўся вельмі эфектыўны. У прадуктовай краме пайшлі яшчэ далей: у «Калінкі» ёсць свае брэндзіраваныя пакеты, што ўражвае ў маштабах невялікага гарпасёлка.



У сёлетнім верасні сям'я адкрыла першую ў Багушэўску станцыю тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў, гэтая навіна хутка пранеслася па пасёлку і сёння на тэрыторыі гандлёвага комплексу ўжо выстраілася чарга з машын. СТА складаюць тры боксы, у якіх ёсць яма і пад'ёмнік, і «лечыць» аўтамабілі дэсант механікаў пад кіраўніцтвам старэйшага сына Яўгена. Тут таксама прапануюць кліентам тыя або іншыя бонусы. Побач з СТА ёсць зона адпачынку — альтанка з відам на ландшафтныя мініяцюры — гэта справа рук Святланы, якая сумяшчае ролі галоўнага бухгалтара і дызайнера. А яшчэ на тэрыторыі комплексу Шухто ўстанавілі арт-аб'ект — нямецкі «мерседэс», які вечарам свеціцца каляровымі агнямі.

Я спытала ў галавы сямейнага бізнесу, як іх закрануў маніторынг цэн, які праходзіць ва ўсіх гандлёвых аб'ектах краіны. «Да нас прыязджалі таксама, але ніякіх парушэнняў не выявілі. На прадукты харчавання мы ставім надбаўку прыкладна каля 20 працэнтаў, так працуем ужо пяць гадоў. Робім стаўку на высокі тавараабарот, разумеем, што працуем для нашых людзей», — адказаў Аляксандр Іванавіч.

За пяць гадоў, што існуе сямейны гандлёвы комплекс, Аляксандр і Святлана стварылі каля 15 рабочых месцаў з добрымі для гарпасёлка зарплатамі, неабходным сацыяльным пакетам. У невялікім калектыве разам адзначаюць юбілеі і святы, кіраўніцтва дорыць супрацоўнікам падарункі. У планах яшчэ шмат цікавых ідэй па развіцці бізнесу.

«Галоўнае ў кожнай справе — упартасць і імкненне да найлепшага выніку. У бізнесе не бывае ўзлётаў без падзенняў, але нельга апускаць рукі, толькі наперад, з поўнай аддачай. Тады праз пэўны час закладзеныя зярняткі дадуць ураджай», — падзяліўся сакрэтам поспеху Аляксандр Шухто.

***Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.***

## ПУСТАЯ КАРОБАЧКА

*У нас у доме ёсць адзін маленькі пакой, у які ні я, ні сын не заходзім. Муж спецыяльна спраектаваў сабе гэты закуток на той час, пакуль не з'явіцца вялікая прасторная майстэрня. Абставіў там усё так, як ён хоча. Замест сямейных фота ў рамачках развесіў на сцяне свае інструменты, каб былі заўсёды пад рукой. Усталяваў стэлажы да самай столі, на якіх акуратненька расставіў зусім не дызайнерскія каробкі з-пад абутку ды бытавой тэхнікі з асабістымі рэчамі. Я той пакойчык жартам называю «пустой каробачкай». На такія асацыяцыі натхніла выступленне амерыканскага коміка і шлюбнага эксперта Марка Гангора пра розніцу паміж мужчынскім і жаночым мозгам. Каб падчас непаразумення разрадзіць напружаную атмасферу ў доме, мы з мужам уключаем гэты камічны ролік і ладзім сямейны прагляд. Бо, як ні круці, смех — найлепшы памочнік у шлюбе.*

*Мозг мужчыны, паводле Гангора, складаецца з маленькіх каробак. Адна — для машыны, другая — для грошай, трэцяя — для работы. «У нас ёсць асобная каробка для вас і для дзяцей. І нават для вашай мамы — дзесьці ў падвале. Каробкі ў нас паўсюль. І вельмі важнае правіла — яны не павінны датыкацца адна да адной! Калі мужчыну задалі нейкае пытанне, ён знаходзіць патрэбную каробку, дастае яе, адкрывае і абмяркоўвае толькі тое, што знаходзіцца ў ёй. А затым закрывае яе і вяртае на месца, але толькі вельмі асцярожна, каб не зачапіць ні адну з іншых каробак!»*

*І галоўнае, у мозгу мужчыны ёсць такая каробка, пра існаванне якой большасць жанчын увогуле не здагадваецца. У ёй... няма наогул нічога. Яна так і называецца «каробка без нічога». І з усіх каробак, што ёсць у мозгу мужчыны, менавіта гэта — яго любімая. І як толькі ў яго з'яўляецца магчымасць, ён бяжыць да сваёй каробкі без нічога з усіх ног. Менавіта таму мужчыны здольныя гадзінамі рабіць нешта, што быццам не патрабуе мазгавой актыўнасці. Напрыклад, рыбачыць ці сядзець перад тэлевізарам, бесперастанку шчоўкаючы кнопкамі на пульце.*

*Усё гэта змаглі замераць ва ўніверсітэце ў Пенсільваніі. Там правялі даследаванне і высветлілі, што мужчыны здольныя не думаць абсалютна ні аб чым (падключылі правады да галавы, каб вымерыць актыўнасць мозгу, а на індыкатарах — прамая лінія) і працягваць дыхаць. Жанчыны так не могуць. У іх свядомасці ўсё бурліць без перапынку.*

*Мозг жанчыны, сцвярджае Марк Гангор, кардынальна адрозніваецца ад мозгу мужчыны. Ён складаецца з вялікага клубка правадоў. Грошы вядуць да машыны, машына — да працы, праца — да свякрові, мужа і дзяцей — абсалютна ўсё ўзаемазвязана. Рухавіком гэтага ўсяго выступае магутная энергія, якая называецца эмоцыямі. «Жанчыны ўхітраюцца азадачыцца абсалютна ўсім... адначасова. І як жа ім гэта падабаецца! Разам з тым ім незразумелая «каробка без нічога». Менавіта таму нішто так моцна не раздражнее жанчыну, як выгляд мужчыны, які нічога не робіць! І, што самае парадаксальнае, я чуў ад многіх жанчын: «А можна разам з ім — у яго «каробку без нічога»? Не! Таму што тады ў ёй ужо штосьці будзе. Да таго ж вы зойдзеце туды і пачняце: «Ведаеш, тут не перашкодзіла б павесіць крыху фотаздымкаў. Вось тут — паставіць маленькі столік, вазу з кветкамі...»*

*Гэтым жа тлумачыць комік розніцу ў тым, як мужчына і жанчына спраўляюцца са стрэсам. Калі мужчына перанапружаны, усё, чаго яму хочацца, гэта схавацца ў сваёй «каробцы без нічога». Апошняе, чаго яму хацелася б у гэты момант, дык размаўляць пра гэта. А жанчына, якая бачыць свайго мужчыну ў такім стане, абавязкова падыдзе і спытае:*

*— Аб чым ты думаеш?*

*— Ні аб чым, — хмура адказвае муж.*

*— Як ні аб чым? Але ж немагчыма зусім ні аб чым не думаць. Ты проста не хочаш мне расказваць.*

*— Ды не, я, праўда, ні аб чым не думаў...*

*А ўсё таму, што калі жанчыны чымсьці заклапочаныя, то проста абавязаны аб гэтым пагаварыць. Каб аблегчыць душу. І не дай бог мужу ў гэты момант даць няпрошаную параду, спрабуючы па-мужчынску знайсці рашэнне праблемы альбо кінуць фразу накшталт «ды не думай ты аб гэтым!» Як сказаў Джон Грэй, «мужчыны з Марса, жанчыны з Венеры». Мы розныя. Галоўнае — навучыцца гэтую розніцу ўдала спалучаць.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


# Сямейная газета

**Выпуск № 18 (200)**


Тыя, хто побач

# Музыка нас звязала

## 15 лістапада вядомая эстрадная спявачка Ірына ВІДАВА адзначае 50-годдзе



**Надыходзячы юбілей ніяк не вяжацца з яе знешнасцю і актыўнасцю.**
**Перажыўшы страту мужа, кампазітара Алега Молчана, гэтая прыгожая таленавітая жанчына прысвячае свае жыццё таму, каб людзі памяталі яго самога, яго музычную спадчыну, і працягвае ўласную выканальніцкую кар'еру. Жыве паўнавартасна і годна — за сябе і за свайго каханага.**

— Упершыню я ўбачыла Алега на сцэне ў 1992 годзе, — успамінае Ірына Відава. — Трапіла на канцэрт з удзелам «Песняроў» і ўразілася, як сучасна пачалі гучаць песні гэтага калектыву. Уважліва прыглядзелася да ўдзельнікаў ансамбля і тут жа звязала абнаўленне рэпертуару з клавішнікам. Адчувалася: ён не проста выканаўца музыкі, а творца. Адзначыла гэта пра сябе і забылася. А ў калядную ноч мне прысніўся сон: мужчына ў плашчы стаіць на пероне вакзала і чакае (я дакладна разумею гэта) менавіта мяне.

*(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)*

Бацькоўскі сход

# НЕ ДАПУСЦІЦЕ ЎЦЁКАЎ!

## Чаму дзеці збягаюць з дому і што рабіць, калі гэта адбылося

**«Знік хлопчык! Вочы блакітныя, рост метр дваццаць. Таго, хто знайшоў, чакае прэмія — веласіпед». Усе памятаюць вельмі самастойнага дашкольніка дзядзьку Фёдара з мультфільма «Трое з Прастаквашына»: ён пакрыўдзіўся на бацькоў, якія не захацелі прытуліць гаваркога ката, і сышоў з дому. Разам з катом. У рэальным жыцці дзеці таксама ўцякаюць з дому. Для бацькоў гэта шок і нечаканасць. Аднак псіхолагі сцвярджаюць, што ўцёкі ніколі не адбываюцца на роўным месцы — на гэта ёсць прычыны.**



### Страх пакарання

Калі вы думаеце, што праблема сыходу з дому датычыцца толькі падлеткаў, чые бацькі злоўжываюць алкаголем і фізічным пакараннем, вы моцна памыляецеся. Гэта можа адбыцца ў любой, нават самай, на першы погляд, паспяховай і ўзорнай сям'і. Прычын сыходу вельмі шмат. Бывае, дзецям проста хочацца пажыць дарослым жыццём, адчуць сябе самастойнымі. Часта ў перыяд падлеткавага бунту яны ўцякаюць з сябрамі за кампанію. Згадайце, як лёгка рашыліся на пабег з дому тры юныя героі з фільма «Каралі лета». Ім хацелася правесці канікулы ў лесе, падалей ад бацькоўскага кантролю, і яны зусім не думалі пра рэакцыю дарослых на іх учынак. «Гэтак жа і дзве непаўнагадовыя мінчанкі перапісваліся ў сацыяльных сетках з маладым чалавекам, які пражываў у Расіі і, не папярэдзіўшы бацькоў, паехалі да яго пагасціць, — прыводзіць прыклад **начальнік аддзела арганізацыі работы Інспекцыі па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі МУС Аляксандр БЛІЗНЮК**. — Мы ішлі за імі па пятах да самага Санкт-Пецярбургу. Знайшлі шукальніц прыгод па месцы жыхарства таго хлопца. Прычым абедзве дзяўчынкі са станоўчых і даволі забяспечаных сем'яў, ім рэгулярна выдзялялі грошы на кішэнныя выдаткі. Падлеткам жа проста захацелася новых адчуванняў».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Хачу дзіця!

# ШТО ЧАКАЕ КАНДЫДАТАЎ У БАЦЬКІ?



## Дазвол на знаёмства з малым, таямніца ўсынаўлення, права на спадчыну...

**Сёння ў Беларусі 6426 дзяцей (2867 дзяўчынак і 3599 хлопчыкаў) маюць патрэбу ва ўладкаванні ў сям'ю. Звесткі пра такіх малых унесены ў базу Рэспубліканскага банка даных аб усынаўленні (удачарэнні) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. А ўсімі пытаннямі адносна ўсынаўлення, а таксама рэгулявання і ўдасканалення заканадаўства ў гэтай сферы займаецца Нацыянальны цэнтр усынаўлення Міністэрства адукацыі. Аднак нельга проста прыйсці ў цэнтр і выбраць сабе дзіця «па гусце». Каб у сям'і адбылося папаўненне, трэба прайсці пэўны шлях. З чаго ён складаецца, нашаму карэспандэнту дапамагала разбірацца намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА.**

### Усынаўленне — гэта назаўжды

Беларусь — даволі кампактная па памерах краіна, у якой няма значных адрозненняў па ладзе ці ўмовах жыцця паміж грамадзянамі ў розных рэгіёнах, таму ўсынавіць дзіця можна ў сям'ю ў любым мястэчку. Нейкія этнічныя, моўныя, рэлігійныя, культурныя асаблівасці малога пры гэтым не будуць ушчэмлены, паколькі ў любым рэгіёне краіны створаны паўнавартасныя ўмовы для развіцця дзетак і іх доступу да адукацыі, медыцыны, культурных каштоўнасцяў, мяркуе спецыяліст.

У нашай краіне існуе шмат варыянтаў уладкавання ў сям'ю. 88 % малых, якія маюць патрэбу ў гэтым, выхоўваюцца ў прыёмных і апякунскіх сем'ях, дзіцячых дамах сямейнага тыпу (аднак гэта часовая форма ўладкавання ў сям'ю). Менавіта ўсынаўленне і ўдачарэнне патрэбна дзецям найперш, паколькі гэта пастаянная форма ўладкавання, гэта назаўжды.

У інтэрнатах засталося не так шмат дзяцей — у асноўным гэта падлеткі, якія ўжо мелі негатыўны вопыт выхавання ў сем'ях. Патранатнае выхаванне (калі малых з інтэрнатаў часова — на святы ці канікулы — забіраюць да сябе патэнцыйныя ўсынавіцелі) як яшчэ адна часовая форма ўладкавання ў сям'ю дае магчымасць дзецям і дарослым прывыкнуць адзін да аднаго і з часам стаць сям'ёй афіцыйна, заўважыла прадстаўніца Мінадукацыі:

— Часовая форма ўладкавання часта становіцца падрыхтоўкай да ўсынаўлення. Апекуны падчас стасункаў з малым прымаюць рашэнне, што яны гатовы яго ўсынавіць. І калі дзеці прыходзяць у гэтую сям'ю ў новым статусе, яны ўжо знаёмыя з ладам жыцця, іншымі малымі ў гэтай сям'і, суседзямі і наваколлем. Такая форма, як правіла, паказвае найлепшыя вынікі пры ўсынаўленні, бо ўсе ўжо падрыхтаваны да гэтага кроку.

### У дзяцей — багаж, у бацькоў — рэсурс

Большасць дзетак, якім патрэбна сям'я, старэйшыя за дзесяць гадоў. 10 % малых — яшчэ не адзначылі дзесяцігоддзе, а немаўлят — не больш за 30. Такія лічбы прыводзяцца ў цэнтры ўсынаўлення, дзе вядуць таксама ўлік кандыдатаў ва ўсынавіцелі. Статыстыку ахвотных усынавіць дзіця вядуць яшчэ і аддзелы адукацыі ўпраўленняў па адукацыі на месцах, якія выконваюць функцыі органаў апекі і папячыцельства.

— Перш чым трапіць на ўлік і стаць кандыдатам ва ўсынавіцелі, ахвотныя быць бацькамі для дзяцей-сірот праходзяць навучанне і атрымліваюць дазвол на гэта ад органа апекі. Калі такія людзі прыходзяць у цэнтр, у іх, як правіла, ужо ёсць дакументы, якія пацвярджаюць іх магчымасць быць усынавіцелямі ці ўдачарыцелямі, — расказала Алена Сімакова. — Яны праходзяць у тым ліку і псіхалагічнае тэсціраванне. Высвятляем, што кіруе іх жаданнем усынавіць дзіця. Здараецца, што выхавальнікі дамоў дзіцячага тыпу ці прыёмныя бацькі з часам самі ўсынаўляюць падапечных.

Прычыны для ўсынаўлення могуць быць самыя розныя. У кагосьці няма сваіх дзетак. Хтосьці гатовы выхоўваць не толькі біялагічных, але і іншых малых, бо дазваляюць магчымасці і ёсць такое жаданне. Для некага важна даць сям'ю і бацькоўскі клопат менавіта дзецям-сіротам. Здараецца, што сям'я хоча праз усынаўленне суцішыць боль ад страты ўласнага дзіцяці, і ў гэтым выпадку павінен прайсці час, пакуль матывацыя патэнцыйных бацькоў будзе адпавядаць інтарэсам дзіцяці. Кожную заяву кандыдатаў на ўсынаўленне ўсебакова разглядаюць на этапе падрыхтоўкі, каб тыя самі зразумелі, гатовыя яны да ўсынаўлення або варта пачакаць, удакладніла спецыяліст:

— Крызісы ў сям'і неабавязкова звязаны з дзецьмі. Праблемы могуць быць і паміж сужэнцамі. І псіхолаг раіць ім утрымацца ад усынаўлення, калі бачыць пэўныя праблемы ў сям'і. Рэагаваць на гэта бурна і востра кандыдатам не варта, бо сістэма працуе шмат гадоў і дзейнічае ў інтарэсах дзіцяці, а не дзеля таго, каб некаму нашкодзіць. Малы прыходзіць у сям'ю са сваім багажом, і ўсынавіцелям трэба знаходзіцца на такой стадыі развіцця, каб быць упэўненымі, што яны з гэтым справяцца. Ім неабходна мець рэсурс, быць гібкімі, каб правільна рэагаваць на ўзроставыя крызісы, хваробы, асаблівасці характару.

Усынавіцелем можа стаць не толькі сямейная пара, але і адзінокая жанчына ці мужчына. Галоўнае, каб даход чалавека дазваляў забяспечыць сябе і дзіця, а не стала так, што з прыходам малога такая няпоўная сям'я ператварылася ў малазабяспечаную. Разглядаецца таксама стан здароўя і жылля заяўніка-адзіночкі. Кандыдат павінен мець пастаяннае жыллё, а не здымнае. У яго могуць папрасіць даведку-характарыстыку з месца работы. Калі не было ўласных дзяцей, правядуць дыягностыку кандыдата, ці свядома ён падыходзіць да рашэння стаць усынавіцелем. Калі ў біяграфіі чалавека раней былі факты пазбаўлення бацькоўскіх правоў, асуджанасці па крымінальных справах супраць чалавека, знаходжанне на ўліку ў пэўных установах, то нават думаць пра ўсынаўленне не варта. Калі ж матывы, даход, жыллё і здароўе дазваляюць выгадаваць дзіця, то ўсынавіцелем можна стаць і не знаходзячыся ў шлюбе.

З пункту гледжання дзяржаўнай падтрымкі ўсынаўленне прыраўноўваецца да форм уладкавання ў апякунскія і прыёмныя сем'і, а таксама дамы сямейнага тыпу. Усынавіцелі могуць штомесяц атрымліваць выплаты на дзяцей, пакуль ім не споўніцца 16 гадоў. Да шасці гадоў — 347 рублёў, ад шасці да 16 — 371 рубель. Пры жаданні атрымліваць выплаты ўсынавіцелям трэба звярнуцца ў адпаведны орган апекі. На працягу паўгода з моманту ўсынаўлення для бацькоў прадугледжаны неаплачваны водпуск на 90 каляндарных дзён (калі ён спатрэбіцца) для лепшай адаптацыі дзіцяці ў сям'і і ўладкавання розных «папяровых» пытанняў са школай, садком і іншых.

Важна памятаць, што розніца паміж усынавіцелем і малым, якога ўсынаўляюць, не павінна быць меншая за 15 і большая за 45 гадоў. А калі вы ўсынаўляеце дзіця ад дзесяці гадоў, то спатрэбіцца і яго згода бачыць вас сваімі бацькамі, а не толькі ваша гатоўнасць і магчымасці. У сваю чаргу 14-гадовы падлетак можа запатрабаваць адмены ўсынаўлення па нейкіх важкіх для яго прычынах.

### Жаданні і магчымасці

Пра магчымасць усынаўлення ў краіне ведае бадай кожны. Рэспубліканскі інтэрнэт-партал http://dadomu.by/, дзе можна прачытаць пра дзетак і паглядзець відэаролікі, штогод наведвае каля 300 тысяч чалавек.

— Сям'я ўсынавіцеляў — тыя, хто гатовы прыняць малога, чакаюць яго, разумеюць адказнасць, гатовыя даць сямейны клопат і выгадаваць. Пры ўсынаўленні дзіця атрымлівае новыя дакументы, імя бацькоў, прэтэндуе на іх спадчыну. Таму важна, каб бацькі разумелі, што дзіця застанецца з імі ўжо на ўсё жыццё, на ўсіх яго этапах, — падкрэсліла Алена Сімакова. — Попыт на немаўлят, які пэўны час назіраўся ў краіне, апошнім часам удалося паменшыць. Дарослыя разумеюць, што чым меншае дзіця, тым вышэйшая рызыка нейкіх хвароб, якія ў яго пакуль не выявілі. Чым старэйшае дзіця, тым лепш яно абследавана, і бацькі ўжо могуць больш дакладна ацэньваць, ці справяцца з парушэннямі ў развіцці, калі тыя ўзнікнуць. Да таго ж, усё больш усынавіцеляў гатовы прымаць у сям'ю дзяцей-інвалідаў. Летась усынавілі, напрыклад, 31 такое дзіця, за дзевяць месяцаў сёлета — 13 малых з інваліднасцю. А ўсяго за гэты год усынавілі ўжо 333 дзіцяці (11 з іх — немаўляты).

Акрамя таго, цяпер дзетак усё часцей усынаўляюць не з інтэрнатаў, а з прыёмных і замяшчальных сем'яў, выхавальнікі якіх таксама будуць даваць згоду на ўсынаўленне, ацэньваць здольнасць кандыдатаў знайсці падыход да дзіцяці. І да гэтага таксама трэба быць маральна гатовым.

**«Малы прыходзіць у сям'ю са сваім багажом, і ўсынавіцелям трэба знаходзіцца на такой стадыі развіцця, каб быць упэўненымі, што яны з гэтым справяцца».**

Усынавіцелі па-рознаму падыходзяць да захавання звестак пра ўсынаўленне. Хтосьці расказвае пра гэта дзіцяці адразу, калі ўпэўніваецца, што малое гатовае ўспрыняць такую інфармацыю. Нехта ўсімі сіламі — да апошняга — ахоўвае гэтую таямніцу. Аднак псіхолагі раяць не ўтойваць такія звесткі, бо калі дзіця даведаецца, што не роднае па крыві, ад некага збоку, то рэакцыя можа быць вельмі негатыўнай для ўсёй сям'і, аж да таго, што яно запатрабуе адмены ўсынаўлення. Тым больш што некаторыя, хоць, здавалася, і маленькія зусім былі, але памятаюць сваё папярэдняе жыццё, патлумачыла Алена Сімакова:

— Ёсць выпадкі, калі таямніцу ўсынаўлення захоўваць нельга. У прыватнасці, калі вы ўсынавілі адно дзіця, а ў яго ёсць родныя браты ці сёстры, будзеце абавязаны з часам інфармаваць забранае вамі дзіця пра іх наяўнасць, каб не згубіліся біялагічныя карані. А вось ахоўваць таямніцу ўсынаўлення ад навакольных ці не — цалкам ваша права. Калі малому спаўняецца 18 гадоў, адмяніць яго ўсынаўленне ўжо проста нельга. Аднак паўналетні можа вярнуцца ў сваю біялагічную сям'ю. Пры гэтым ён можа быць нашчадкам і ва ўсынавіцеляў, і ў кроўных бацькоў.

А вы ведалі?

# ДАПАМОГА АНЛАЙН

## Яе пачалі аказваць падлеткам на новай платформе

**Бясплатная кваліфікаваная псіхалагічная дапамога для падлеткаў у форме анлайн-кансультацый у аўдыя- і відэачатах арганізавана ў Беларусі Рэспубліканскім цэнтрам псіхалагічнай дапамогі БДПУ сумесна з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ). Спачатку рэсурс будзе працаваць у тэставым рэжыме, каб сабраць зваротную сувязь ад карыстальнікаў і палепшыць работу сэрвісу.**

Пры распрацоўцы платформы яе арганізатары цесна супрацоўнічалі з падлеткамі і моладдзю, каб зразумець, што іх хвалюе найбольш, якой дапамогі яны чакаюць і як яе лепш аказаць. Цяпер talk2ok.by — месца, куды малады людзі могуць звярнуцца па дапамогу і падтрымку ў крызіснай сітуацыі і напрамую звязацца з псіхолагам для кансультацыі. Або знайсці карысную інфармацыю і паспрабаваць самастойна вырашыць хвалюючыя іх пытанні.

З новым рэсурсам супрацоўнічае каля 30 кваліфікаваных псіхолагаў з вопытам работы не менш за тры гады. Усе яны прайшлі трэнінгі па рабоце з платформай і кансультаванні падлеткаў, якія знаходзяцца ў крызісным стане.

Калі малады чалавек не вызначыўся, ці гатовы распавесці пра сваю праблему спецыялісту, на платформе ён можа пагаварыць пра сваю бяду з роўным кансультантам, то-бок са студэнтам — будучым псіхолагам. Словы «я ведаю, што ты адчуваеш» дапамагаюць падлеткам гаварыць шчыра і адкрыта.

На talk2ok.by можна таксама пачытаць публікацыі на хвалюючыя падлеткаў тэмы, падумаць над сваёй сітуацыяй і прыняць рашэнне, параўнаўшы яе з прачытаным. Тут змешчаны таксама хуткія парады, як узняць самаацэнку, што рабіць, калі цябе крыўдзяць у школе, або як вызначыцца з будучай прафесіяй. А ў спецыяльным раздзеле ёсць артыкулы і для бацькоў падлеткаў.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

# Музыка нас звязала

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Той сон абудзіў нейкае прадчуванне кахання. У 1993 годзе я заканчвала БДПУ імя М.Танка і шукала аранжыроўшчыка для сваіх песень. Мне парэкамендавалі Молчана.

Пры першым жа позірку на новага знаёмага адразу ўспомніла і канцэрт, і свой сон: Алег знешне быў падобны на мужчыну ў плашчы. Мы заўсёды лічылі нашу сустрэчу лёсавызначальнай. Адразу адчулі ўзаемнае прыцягненне. Невербальныя сігналы далі зразумець: Алег мной зацікавіўся. Пазней ён прызнаўся, што, убачыўшы мяне, адразу падумаў: «Мне б такую жонку!» У той жа вечар запрасіў мяне на каву, пасля мы доўга гулялі па горадзе і не маглі нагаварыцца. Здавалася, я ведаю гэтага чалавека ўжо даўно... Безумоўна, адоранасць Алега Молчана адыграла ролю магніта. Ён ведаў свае плюсы: у першую ж сустрэчу сеў за раяль і пачаў іграць. Бліскучая тэхніка, энергетыка, здольнасць імправізаваць — супраць гэтага цяжка было ўстаяць. Тым больш я толькі-толькі праслухала курс лекцый па гісторыі музыкі, на якіх наша выкладчыца расказвала пра вялікіх кампазітараў з такім натхненнем, што яны паўставалі перад вачыма, быццам жывыя. Алег па ўсіх прыкметах быў вельмі падобны на класікаў — чалавек, апантаны творчасцю. З першага ж дня я зразумела: ён — геній. І калі да сустрэчы з Молчанам уяўляла сябе кампазітарам, то пасля яе адмовілася ад падобных амбіцый.

Я была зялёнай 20-гадовай выпускніцай ВНУ, а Алег, як сам жартаваў, шырока вядомым у вузкіх колах 28-гадовым музыкантам. За 26 гадоў сумеснага жыцця муж неверагодна ўзбагаціў мяне прафесійна, дапамог знайсці свой стыль, інтанацыю, індывідуальнасць. Ён адкрыў для мяне таемны, інтымны свет нараджэння мелодыі. Нас аб'ядноўвала каханне адзін да аднаго і любоў да музыкі.

Алег — Авен па гараскопе — быў больш запальчывы, чым я, Скарпіён, прадстаўнік воднай стыхіі. Нейкія рознагалоссі паміж намі, вядома, здараліся, асабліва на этапе, пакуль мы прыціраліся адно да аднаго. Але, нават пасварыўшыся, мы не грукалі дзвярыма, заўсёды начавалі дома і знаходзілі кампраміс. З гадамі сталі мудрэйшыя. Аднойчы я заўважыла: «Алег, навошта мы сваримся? Усё роўна ж заўтра памірымся». І ён пагадзіўся. Спадзяюся калі-небудзь напісаць гісторыю нашага кахання. Мне здаецца часам, што далёка не ўсе разумеюць, якое гэта вялікае багацце для грамадства — шчаслівыя людзі. Яны распаўсюджваюць вакол сябе святло.

## Ляцець з адным крылом

***— Вось ужо тры гады вы — удава. Што было для вас самым складаным за гэты перыяд? Чаму прыйшлося вучыцца?***

— Спатрэбіўся час, каб прывыкнуць да фізічнай адсутнасці Алега. Мы ж амаль не разлучаліся. Пастаянна разам: дома, у студыі, на адпачынку, у гасцях. Застаўшыся адна, машынальна аглядвалася ў пошуках мужа і лавіла сябе на дзіўным адчуванні, што яго няма побач. А яшчэ мы з Алегам былі кінаманамі: часта па вечарах з задавальненнем глядзелі фільмы, абменьваліся ўражаннямі. Цяпер гэтага наогул няма ў маім жыцці. З сыходам мужа яшчэ глыбей усвядоміла, наколькі мы былі шчаслівыя. Жылі проста як у раі. Шчыльнае «кальцо» кахання Алега абараняла мяне ад уколаў навакольнага свету. Цяпер яны больш адчувальныя, і я разумею, што жыццё не такое цудоўнае, як мне здавалася раней.



***— Людзі, якія добра вас ведаюць, дзівяцца, як стойка вы перажылі смерць мужа. Вам каштавала вялікіх намаганняў стрымліваць эмоцыі, не паддавацца гору?***

— Я забараніла сабе ўпадаць у дэпрэсію. Ведаю дакладна: Алег гэтага не хацеў бы. Не перакладала свае гора на іншых і не дазваляла, каб яно мяне разбурыла. Справілася і пераканалася: я — моцная. Упэўнена, муж ганарыўся б тым, што я працягваю спяваць, пісаць, выступаць.

***— Хтосьці «сыходзіць» у запой, а вы «сышлі» ў творчасць?***

— Занялася справай. Устанавіла помнік Алегу на Усходніх могілках, мемарыяльную дошку — на доме па вуліцы Ракаўскай, дзе муж правёў першыя гады жыцця, побач — музычную лаву з яго творамі. Праца, творчасць, безумоўна, ратуюць. Я асвоіла шмат з таго, чым раней у нашай студыі займаўся выключна Алег. Падрыхтавала тры канцэрты: «Я нясу вам дар», «Алег Молчан — 55», «Там, высока», выдала сем зборнікаў-сшыткаў «Алег Молчан. Песні для голасу і фартэпіяна», выпусціла два дыскі фірмы «Мелодыя». 26 кастрычніка, у дзень смерці Алега, адбылася прэзентацыя зборніка яго харавых твораў. Муж пакінуў мне песень на некалькі жыццяў — дык навошта ж ставіць кропку?

**«Застаўшыся адна, машынальна аглядвалася ў пошуках мужа і лавіла сябе на дзіўным адчуванні, што яго няма побач».**

***— Пасля сыходу мужа ранейшыя сябры і знаёмыя засталіся з вамі?***

— На шчасце, у сваёй большасці — так. Алег быў чалавекам добрым, шчырым, велікадушным, надзейным; такімі ж людзьмі мы сябе і акружалі. З іх боку адчуваю ўдзел, разуменне і падтрымку.

## Захаваць твар

***— Калі сыходзіць маладосць, у многіх жанчын, асабліва ў тых, хто навідавоку, пачынаецца паніка. Вам яна знаёмая?***

— Пакуль не (*смяецца*). Адчуваю сябе ў выдатнай форме, з аптымізмам набліжаюся да прыгожай даты. «Спелыя» жанчыны мне заўсёды здаваліся больш цікавымі, чым маладыя. Тут ужо відаць асобу, ёсць біяграфія, досвед, свой стыль. І ўсё гэта ўзбагачае творчасць, яна становіцца глыбейшай, больш шматграннай.

***— Многія здзіўляюцца таму, як цудоўна выглядаеце. Ёсць нейкі сакрэт?***

— Сакрэтаў няма. Дзякуй генетыцы, бацькам. Мусіць, па прыродзе сваёй я схільная да здаровага ладу жыцця. Мне не складана сачыць за знешнасцю, сілкаваннем, фізічна сябе нагружаць. Аддаю перавагу натуральным прадуктам, ведаю меру ў ежы. Раней спала па дзесяць гадзін, зараз для паўнацэннага адпачынку дастаткова сямі. Мне падабаецца актыўнасць, рух. У дзяцінстве займалася фігурным катаннем і вельмі ўдзячная гэтаму віду спорту. Нават сёння з задавальненнем устану на канькі. З маладосці захапляюся ёгай — яна падцягвае, робіць стройнай, вучыць правільна дыхаць. Шэсць гадоў удзельнічаю ў Мінскім паўмарафоне, які арганізоўвае Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі. Усё гэта мне ў радасць, хоць і каштуе пэўных намаганняў.

***— Цяпер індустрыя прыгажосці прапаноўвае шэраг разнастайных метадаў і тэхналогій. Да якіх з іх вы звяртаецеся?***

— У касметалогіі — да карбаксітэрапіі (дазаванага ўвядзення падскурна вуглякіслага газу. — **Аўт.**), да індывідуальна падабраных пілінгаў для твару. Афарбоўваю і ўкладваю валасы з дапамогай сучасных тэхналогій у «Тэатры прычосак» Анастасіі Ятковай.

***— А калі спатрэбіцца, ляжаце «пад нож» пластычнага хірурга?***

— Не думаю. Нашы твары запамінаюцца сваёй натуральнай прыгажосцю, непаўторнасцю, індывідуальнасцю: гэта варта падкрэсліваць. А пластыка робіць іх падобнымі, быццам кланаванымі, а таму зусім нецікавымі.

***— Якіх правілаў прытрымліваецеся пры выбары паўсядзённага гардэробу і ўпрыгожванняў?***

— Залатое правіла — пачуццё меры. Імкнуся нестандартна апранацца і пазбягаю ўсялякай празмернасці.

***— Вам хтосьці дапамагае ствараць сцэнічныя вобразы? Якія вашыя ўласныя перавагі ў гэтым сэнсе?***

— Натхняльным стала для мяне супрацоўніцтва з дызайнерам Таццянай Давыдзенкай. Яна ўлюбёная ў сваю справу, і мы з ёй «на адной хвалі». Сёння аддаю перавагу элегантным, вельмі жаноцкім сукенкам «у падлогу». Захоўваю сваю прыхільнасць да стразаў, крышталяў Сваровскі — усё гэта дадае раскошы, ззяння, бляску і, на мой погляд, стварае чароўную аўру.

**«Я забараніла сабе ўпадаць у дэпрэсію. Ведаю дакладна: і Алег гэтага не хацеў бы. Не перакладала свае гора на іншых і не дазваляла, каб яно мяне разбурыла».**

## Адзінокай і свабоднай сябе не адчуваю

***— Што дарыў вам звычайна на дні нараджэння і памятныя даты муж? Які прыемны сюрпрыз рыхтуеце сабе самі з нагоды юбілею?***

— Алег любіў рабіць падарункі і вылучаўся шчодрасцю. Гэта заўсёды было прыемна, але больш за ўсё я радавалася, калі ён дарыў песні, песні-«брыльянты». Яны і сёння саграваюць, натхняюць, суцяшаюць. На юбілейным канцэрце прадстаўлю прэм'еру песні «Там, за дажджом», якую напісала і прысвяціла Алегу. Гэта мой падарунак — і сабе, і яму.

***— Лічыцца, што жанчыны, якія былі шчаслівыя ў шлюбе, пасля смерці мужа ніколі не застаюцца доўга адзінокімі, а хутка зноў выходзяць замуж. Ці ёсць у вас прэтэндэнты на руку і сэрца?***

— Безумоўна, ёсць, некаторыя з іх адкрыта кажуць аб сваім жаданні ісці па жыцці разам са мной. Але я не гатова да новых адносін. Не адчуваю сябе свабоднай, адзінокай жанчынай. Фізічна Алега няма побач, але ў духоўным сэнсе ён па-ранейшаму са мной, мы ўвесь час з ім «на сувязі». У думках размаўляю з ім, раюся, ён мне падае знакі, падказвае, як паступаць. Ніколі не забуду, як, напісаўшы тэкст песні «Там, за дажджом», падышла да акна і ўбачыла на небе воблака ў выглядзе птушкі, якое на маіх вачах трансфармавалася ў чалавека з фірменным жэстам Алега — паднятай уверх да прывітання рукой. І гэта пераконвае: няхай мы ў розных сусветах, але наша гісторыя кахання працягваецца.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**
**Фота Аляксея ВОЛКАВА**
**прадстаўлена**
**Ірынай ВІДАВАЙ-МОЛЧАН.**

Хто лепшы?

# ПАДЗЯЛІЦЦА СВАЁЙ ТВОРЧАСЦЮ

**У Мінску ўпершыню прайшоў фестываль-злёт «Дружная сям'я — моцная краіна!». На сцэне Палаца культуры чыгуначнікаў за званне найлепшай спаборнічалі дзевяць творчых сем'яў, па адной ад кожнага раёна сталіцы.**

Са сцэны канкурсанты прадэманстравалі гледачам свае разнабаковыя таленты. Прадставілі на суд журы прэзентацыю, а таксама праявілі сябе ў інтэлектуальным спаборніцтве. Акрамя таго, кожная сям'я падрыхтавала творчы нумар з адметным стылем. Бацькі з дзеткамі спявалі, танцавалі, чыталі вершы. У прыватнасці, сям'я Юнгіных, у якой выхоўваецца восем дзяцей, стварыла сапраўдны інструментальны ансамбль, у якім дзеці іграюць на цымбалах, балалайках, баяне і рэйнстыку (так званай палцы дажджу). А вось гаспадыня сям'і Пашкевічаў пакарыла ўсіх вакальнымі здольнасцямі.

У выніку Гран-пры першага фестывалю-злёту заваявала сям'я Зайцавых з Фрунзенскага раёна. Дыплом першай ступені атрымала сям'я Ліпскіх з Першамайскага раёна. «Серабро» — у Юнгіных з Партызанскага. На трэцім месцы — сям'я Пашкевічаў з Кастрычніцкага.

Пераможцы Зайцавы выхоўваюць чацвярых дзяцей. Старэйшая дачка, Насця, студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Сын Даніла скончыў музычную школу па класе фартэпіяна, спявае ў хоры. Малодшыя, Мілана і Амеліта, таксама наведваюць музычную школу, спяваюць, танцуюць і займаюцца гімнастыкай. Зайцавы называюць асновай сваёй сям'і творчасць, да таго ж, яны актыўна займаюцца спортам, а таксама любяць падарожнічаць. «Прыняць удзел у конкурсе мы вырашылі, таму што хацелі падзяліцца сваёй творчасцю з усімі», — кажуць яны.

— Фестываль падводзіць рысу пад усімі сямейнымі святамі, якія прайшлі ў кастрычніку: Дзень маці, Дзень бацькі, Тыдзень бацькоўскай любові, Дзень бабуль і дзядуляў. Такі злёт мы праводзім упершыню, і, спадзяюся, ён стане традыцыйным, — адзначыла **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ.**

— Незвычайнасць нашага фестывалю ў тым, што гэта не проста «тата, мама, я — дружная сям'я». У цэнтры ўвагі на працягу ўсяго мерапрыемства былі радавое дрэва і пераемнасць пакаленняў, — падкрэсліў **старшыня праўлення Мінскага гарадскога аддзялення грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру» Дзмітрый КАРАНЬ.**

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# НЕ ДАПУСЦІЦЕ ЎЦЁКАЎ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Часам прычынай сыходу становіцца неспрыяльная абстаноўка ў сям'і. Герой фільма Андрэя Звягінцава «Без любові» 12-гадовы Алёша не вытрымлівае пастаянных сварак паміж мамай і татам, якія збіраюцца развесціся, але не могуць вырашыць, з кім пакінуць сына, і ўцякае з дому. На жаль, устанаўліваюцца і такія факты, калі прычынай сыходу становіцца ў тым ліку і гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару з боку блізкага акружэння дзіцяці. «Калі я сама была падлеткам, — распавядае **дзіцячы псіхолаг Людміла ГУБСКАЯ**, — з дому ўцякла 15-гадовая дачка мамінай супрацоўніцы. Колькі сябе памятаю, тую сям'ю пастаянна ставілі ў прыклад. Таму я вельмі здзівілася, не разумела, як можна захацець сысці з такой добрай сям'і. А потым высветлілася, што нічога добрага там не было. Дзяўчынкі дамагаўся айчым. Яна спрабавала пагаварыць аб гэтым з маці. Але тая, уладкоўваючы сваё асабістае жыццё, не звярнула ўвагі на стан дачкі».

Сучасныя дзеці ўцякаюць з дому даволі рана — пачынаючы з 12 гадоў. Асноўная прычына сыходу — няма кантакту з бацькамі, страх пакарання. Напрыклад, мама і тата ў канфліктнай сітуацыі, не разбіраючыся, становяцца на бок настаўніка. Альбо калі на дзіця моцна сварацца за сапсаваныя ці згубленыя рэчы — тады яно можа ўцячы проста таму што разбіла тэлефон. «Часам падлеткі не вяртаюцца дамоў, атрымаўшы дрэнную адзнаку ці здзейсніўшы штосьці супрацьпраўнае ў школе, бо баяцца пакарання, — працягвае Аляксандр Блізнюк. — Вось апошні прыклад. У адным з абласных цэнтраў падлетак пакурыў у школе. Пра гэта даведаліся настаўнікі. Хлопец пабаяўся пакарання і не вярнуўся дамоў. Спецыяльна пакінуў мабільны тэлефон у гандлёвым цэнтры, каб яго не знайшлі. Начаваў у пад'ездах, на гарышчы. Затрымалі яго за 30 кіламетраў ад абласнога цэнтра, дзе ён спрабаваў купіць білет, каб паехаць вандраваць у Мінск».

## «Маме варта быць больш гнуткай»

***— Што рабіць, калі падлетак не вярнуўся дадому са школы?***

— Перш за ўсё трэба звязацца з настаўнікам ці кіраўніком гуртка, секцыі, якія ён звычайна наведвае пасля ўрокаў, — кажа Аляксандр Блізнюк. — Абавязкова трэба абзваніць сяброў дзіцяці. Але для гэтага трэба ведаць, з кім сын ці дачка звычайна кантактуе. На жаль, на практыцы далёка не ўсе бацькі валодаюць такой інфармацыяй. Не ведаюць яны, і ў якіх сацсетках зарэгістраваны падлетак і тым больш з кім ён там і пра што перапісваецца. Калі бацькі абзванілі сваякоў, знаёмых і ніякай інфармацыі не атрымалі, трэба паведаміць аб знікненні дзіцяці па нумары 102. На гэта паведамленне адразу ж прыедзе супрацоўнік міліцыі. Да размовы варта падрыхтавацца: скласці спіс месцаў, цікавых дзіцяці, знайсці самы свежы фотаздымак, пажадана ў тым адзенні, у якім ён сышоў. Наша нацыянальнае заканадаўства ў частцы вышуку грамадзян, якія прапалі без вестак, з'яўляецца адным з перадавых. У некаторых краінах, нават у суседніх, для таго, каб міліцыя пачала пошукі павінна прайсці трое сутак. У нас такі часовы прамежак не ўстаноўлены. Лічу, гэта правільна. Бо чым раней пачаць шукаць, тым больш шанцаў, што з дзіцем нічога не адбудзецца. Горад поўны небяспекі. Дзіцяці трэба есці — значыць, магчыма, яму прыйдзецца красці ў крамах. Каб сагрэцца і пераначаваць, падлетак пойдзе ў пад'езды, падвалы, дзе можа сустрэць людзей, якія ўяўляюць для яго небяспеку. Дзіця могуць уцягнуць у незаконны абарот наркотыкаў, яно можа стаць ахвярай злачынстваў. У прыватнасці, была сітуацыя, калі непаўналетнія дзяўчынкі самавольна сышлі з дому, каталіся на электрычках, і асацыяльныя грамадзяне «пашкадавалі» іх, пачаставалі півам ды цыгарэтамі. А потым запрасілі да сябе ў прытон, дзе датычна іх здзейснілі гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару. Дзяўчаты гэта спрабавалі схаваць, не расказвалі. Але па іх паводзінах адчувалася, што адбылося штосьці экстраардынарнае. Пасля размовы з псіхолагам у спецыяльным пакоі дружалюбным дзецям, гэтыя факты пацвердзіліся. Удалося дэталёва ўстанавіць абставіны і прыцягнуць да адказнасці асоб, якія здзейснілі злачынства ў адносінах гэтых дзяцей.

**«Калі бацькі абзванілі сваякоў, знаёмых і ніякай інфармацыі не атрымалі, трэба паведаміць аб знікненні дзіцяці па нумары 102».**



***— Як хутка ўдаецца знайсці ўцекачоў?***

— Ад літаральна гадзін да сутак-двух і больш. Усё залежыць ад сітуацыі. Часам проста ў падлетка разраджаецца мабільны тэлефон, ён сядзеў у сябра дома і не заўважыў, што ўжо даволі позна.

Ёсць катэгорыя непаўналетніх, якія пастаянна сыходзяць з дому. Як правіла, гэта падлеткі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія патрабуюць вызначанай медыцынскай і псіхалагічнай карэкцыі.

Яшчэ адзін не зусім тыповы выпадак адкрытага сыходу з дому прыявіла **сямейны псіхолаг Таццяна ШАРАНДА**. «Да мяне прыйшла мама — кіраўнік дастаткова буйной кампаніі. Яна сказала, што не можа наладзіць адносіны са сваім сынам. Пасля размовы з ёй у мяне ўжо было адчуванне, што моцная мама ўстанаўлівае свае правілы ўнутры сям'і. Муж — спакойны, не супраціўляецца. А вось старэйшы сын пратэстуе. Я папрасіла прывесці хлопчыка. На той момант яму было гадоў 12. Я была прыемна здзіўлена: шырокі кругагляд, прыгожы стыль маўлення — у мяне было такое адчуванне, што я размаўляю з дарослым самадастатковым чалавекам. Неяк мама мне патэлефанавала ўся ў слязах, папрасіла ўгаварыць сына не кідаць дзявяты клас, бо ён проста адмовіўся хадзіць у гімназію. Пасля размовы хлопец пагадзіўся, што варта хоць бы атрымаць атэстат, але, як толькі здаў экзамены, паехаў у раённы гарадок. Там жыла яго бабуля. Мама прасіла, каб я яго ўгаварыла вярнуцца назад. Для яе быў важны статус: як гэта — прамяняць прэстыжную гімназію на звычайную школу маленькага гарадка? Пасля 11 класаў хлопец не вярнуўся ў Мінск, паехаў вучыцца ў Расію. Гэтым летам ён заходзіў да мяне ў кабінет. Сёння ён добра зарабляе, забяспечвае не толькі сябе, але і дапамагае бабулі. А вось у адносінах да мамы засталася крыўда. Ён прызнаўся, што калі б застаўся ў Мінску пад маміным ціскам, то хутчэй за ўсё ў форме пратэсту кудысьці сышоў бы. Маме варта быць больш гнуткай, не патрабаваць «толькі так і ніяк інакш». Гэта тая катэгорыя падлеткаў, з якой можна дамаўляцца. Мама ж прывыкла ў сваёй арганізацыі жорстка ўстанаўліваць правілы, якія ўсе бясспрэчна выконваюць. Яна перанесла сваю мадэль узаемаадносінаў на працы дадому. Пратэст сына — гэта быў сігнал, што надышоў час перастаць успрымаць дзіця як сваю ўласнасць. Але яна, на жаль, ім не скарысталася».

**«Наша нацыянальнае заканадаўства ў частцы вышуку грамадзян, якія прапалі без вестак, з'яўляецца адным з перадавых».**

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## Парады бацькам

1. У бацькоў з дзецьмі павінны быць хоць нейкія агульныя інтарэсы. Гэта могуць быць сумесныя прагляды фільмаў, паходы. Калі дзіця займаецца спортам, то трэба прыходзіць на яго спаборніцтвы. Калі малюе, наведваць выставы, якія яму цікавыя. Неабавязкова ўнікаць у дэталі, але быць у курсе і паказваць сваю зацікаўленасць трэба абавязкова. Важна цікавіцца, чым жыве дзіця, якія думкі ў яго галаве, штодня знаходзіць час для шчырых размоў. Не лічыце дзіцячыя праблемы малаважнымі, не абясцэньвайце іх пачуцці.

2. Дарослыя абавязкова павінны ведаць усіх сяброў і знаёмых свайго дзіцяці, а таксама пажадана і іх бацькоў. Прычым варта зрабіць першы крок, каб пазнаёміцца з імі. Можна запрасіць новых знаёмых сына ці дачкі ў госці, папрасіць пакінуць тэлефон для сувязі. Тады можна будзе прадухіліць сыход. Бо дзеці, як правіла, дзеляцца з блізкімі сябрамі сваімі намерамі.

3. У падлетка павінна быць свая прастора. Бо сёння патрэба ў адзіноце прызнаецца як базавая. Калі сям'я не можа дазволіць сабе выдзеліць асобны пакой для кожнага дзіцяці, павінны быць устаноўлены хоць перагародкі, можна дамовіцца пра асабісты куток ці пра час, на працягу якога малога не будуць турбаваць. Калі ён дзеліць пакой з бацькамі, братамі і сёстрамі, то павінен быць упэўнены, што яго асабістымі рэчамі не будуць карыстацца без яго згоды.

Дзіцячы псіхолаг Людміла ГУБСКАЯ:

# «Не ляпайце дзвярыма...»



**«Уцёкі — гэта не тое, што адбываецца ў здаровай сям'і са здаровымі адносінамі. Гэта, як правіла, крык аб дапамозе, просьба падлетка змякчыць дамашні рэжым, змірыцца з тым, што ён не геній, паважаць права на выбар сяброў...**

Сумна, калі ў сям'і камунікацыя будуецца па прынцыпе «ляпнуў дзвярыма». Тата раззлаваўся — і сышоў у гараж. Мама таксама, замест таго, каб спакойна высветліць адносіны, у істэрыцы грукае дзвярыма. Дзеці, падыходзячы да падлеткавага ўзросту, хутчэй за ўсё будуць выказваць пратэст і нязгоду гэтак жа. Не канструктыўна, у дыялогу, просьбах, а дэструктыўна — ляпаць дзвярыма і сыходзіць у свой пакой. Калі яны ведаюць, што гэта прастора таксама парушаецца і няма магчымасці ў адзіноце перажыць эмоцыі, яны могуць сысці з дому, на ноч гледзячы.

Да працяглых сыходаў дзеці, як правіла, рыхтуюцца, адкладаюць грошы, збіраюць рэчы. Падчас сварак могуць кідаць правакацыйныя фразы: «Ды вы будзеце толькі шчаслівыя, калі я сыду». Гэта заўсёды прыкметна, але бацькі чамусьці не хочуць бачыць. Таму адказнасць за сыход з дому нясуць абодва бакі: той, хто сышоў, — 50 %, і тыя, ад каго сышоў, — 50 %.

Часта дзеці сыходзяць, бо баяцца пакарання. А потым не хочуць вяртацца дадому з-за таго, што разумеюць: пакаранне будзе яшчэ большым. Атрымліваецца замкнёнае кола. Не варта сустракаць уцекачоў скандалам. Падлетак не вынесе з крыкаў ніякай інфармацыі, у памяці застанецца толькі крыўда, і ён будзе перакананы ў тым, што правільна зрабіў, калі ўцёк. Больш за тое, гэта можа паслужыць штуршком да таго, што ён сыдзе зноў, прычым усур'ёз і надоўга. Аднак бацькі не павінны падаўляць свае эмоцыі. Проста прыняць падлетка назад з радасцю, не сказаўшы пра свае перажыванні, таксама не варыянт: дзіця павінна ведаць пра непакой бацькоў. Рэакцыя на вяртанне павінна быць адэкватнай прычыне ўцёкаў. Калі дзіця баялася прыйсці дадому, бо атрымала дрэнную адзнаку, канечне, першае, што яно павінна пачуць: «Няважна, што ў цябе там з матэматыкай, ты можаш нам пра гэта сказаць. Мы цябе любім і падтрымаем, нягледзячы ні на што». Выхаванне не павінна зводзіцца толькі да пакарання, тым больш фізічнага, бо гэтым даверлівыя адносіны з дзіцем не выбудуеш.

**«Выхаванне не павінна зводзіцца толькі да пакарання, тым больш фізічнага, бо пагрозамі і пакараннямі даверлівыя адносіны з дзіцем не выбудуеш».**

У мяне дыпломная работа была якраз па сіндрому сыходу і бадзяжніцтва дзяцей-падлеткаў. Што вельмі ўразіла: адзін з даследчыкаў, які спецыялізаваўся на гэтай тэме, пісаў пра тое, што працягласць груднога выкормлівання ў такіх дзяцей была максімум тыдзень. У аснове ўцёкаў заўсёды ляжыць адсутнасць блізкіх адносін, душэўнай цеплыні. Падлетку важна не столькі тое, што да яго адчуваюць, а тое, як яму гэта дэманструюць.

# КАБ ЗАПОМНІЦЬ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

## Колькі каштуе вяселле і ці залежыць «якасць» ад кошту?



**Супрацоўнікі ЗАГСаў адзначаюць, што пышныя вясельныя ўрачыстасці — з картэжамі, лімузінамі, крыналінамі, лебедзямі на капотах, танцамі ўсю ноч напралёт, мноствам гасцей і шмат'ярусным беласнежным тортам паступова сыходзяць у мінулае. У апошнія гады ў моду ўвайшлі «камерныя» вяселлі ў фармаце «свята для блізкага кола».**

Падчас роспісу маладыя ўсё часцей абмяжоўваюцца бацькамі і сведкамі, а потым адзначаюць нараджэнне новай «ячэйкі грамадства» ў коле сям'і — у рэстаране або нават дома. Гэта, вядома, сур'ёзная эканомія. І ўсё ж далёка не ўсе (асабліва гэта датычыцца нявест) гатовыя да такога фармату «галоўнага дня свайго жыцця». Даваце палічым, у якую суму абыдзецца ў цяперашнія часы вяселле — класічнае «шырокае» і больш сціплае, бюджэтнае.

Уласна кажучы, менавіта з разліку вясельнага бюджэту супрацоўнікі wedding-агенцтваў і раяць пачынаць падрыхтоўку да вяселля. Неабходна ўзяць аловак і сшытак і скласці дакладны спіс меркаваных выдаткаў. А пасля супаставіць яго з наяўнай сумай і выкрасліць тое, без чаго можна абысціся. Асноўных пунктаў некалькі. Рэгістрацыя шлюбу; вобразы нявесты (шлюбная сукенка і, магчыма, убор на другі дзень) і жаніха; банкет (арэнда кафэ або рэстарана, шоу-праграма); дэкор і аксесуары (у тым ліку заручальныя пярсцёнкі); вясельныя спецыялісты; магчыма — арэнда катэджа ці аграсядзібы на другі дзень. Кожны з пунктаў рэкамендуецца афармляць у табліцу (асабліва калі вы і ваша прафесія далёкія ад бухгалтарскага ўліку) — так інфармацыя больш наглядная, і стане больш зразумела, на чым можна зэканоміць.

### ПАЧНЁМ... З ПАЧАТКУ

Вяселле пачынаецца не з банкету, а з роспісу ў ЗАГСе. І ўсё гэта трэба адзначыць шампанскім і закусіць цукеркамі (што таксама не варта забываць). Але перш неабходна аплаціць саму рэгістрацыю шлюбу. Танней распісацца ў ЗАГСе, даражэй — выязная рэгістрацыя. Рэгістрацыя заключэння шлюбу, уключаючы выдачу пасведчання, сёння складае адну базавую велічыню (з 1 студзеня 2022 года гэта 32 беларускія рублі). Урачыстая рэгістрацыя шлюбу ў ЗАГСе (з прыцягненнем акампаніятара, у спецыяльна абсталяваным памяшканні) абыдзецца ў 54-62 рублі (без уліку ПДВ). Выязная — у 71—125 рублёў (без уліку транспарту і ПДВ). Трэба памятаць, што выязная рэгістрацыя не прадугледжвае выдачы пасведчання, таму ўзаконіць шлюб супрацоўнікі ЗАГСаў рэкамендуюць маладым загадзя, распісаўшыся без пышнай цырымоніі. Што датычыцца пачастунку пасля роспісу, то разлічваецца яго колькасць так: каробка цукерак з разліку адна на траіх, на кожнага госця трэба ўзяць з сабой паўлітра безалкагольнага напою і палову бутэлькі шампанскага або віна.

### СУКЕНКА І КАСЦЮМ

У вобразе нявесты галоўны пункт выдаткаў — зразумела, шлюбная сукенка. Класічны набор у дадатак — туфлі, сумачка, вэлюм, ювелірныя ўпрыгажэнні, букет. З гэтага спіса можна нешта выкрасліць (напрыклад сумачку або вэлюм), а можна, наадварот, дадаць: дыядэму ў валасы або, напрыклад, футрачка ў адзіным стылі з сукенкай, бо справа ідзе да зімы. Асабліва калі запланавана фотасесія на вуліцы.

Трэба сказаць, што вясельная мода сёння адыходзіць ад класічнага белага колеру, хоць ён паранейшаму запатрабаваны. Адна з тэндэнцый сезона — шлюбная сукенка колеру «шампань». Раскошнае цёплае адценне падыходзіць не ўсім, але калі ўжо яно вам да твару — застаецца толькі дадаць у вобраз пяшчотны макіяж у той жа каляровай гаме і дапоўніць яго абуткам у моднай бэжавай або нюдавай гаме. І важна памятаць, што цёплы колер «шампань» не прымае суседства халоднага белага, у тым ліку і ў букеце нявесты.



Яшчэ адна вясельная модная тэндэнцыя — далікатныя блакітныя тоны сукенкі. Для тых дзяўчат, у каго бледная скура з халодным падтонам, светлыя вочы і валасы — гэта проста знаходка: нябеснае адценне зробіць вобраз сапраўды незямным, анёльскім. Можна выбраць класічны белы колер, але дадаць у вобраз дэталі блакітнай гамы.

Што датычыцца крою, цікавая асаблівасць апошніх вясельных сезонаў — сукенкі-трансформеры. Яны, дарэчы, дазваляюць абысціся без асобнага ўбору для другога дня (калі такі мяркуецца) і пры гэтым выглядаць па-новаму. Або лёгка змяніць вобраз увечары. Дапусцім, на ўрачыстай частцы свята нявеста ў сукенцы даўжыні «максі», а ўвечары нескладана адшпіліць пышную спадніцу і паўстаць у аблягальнай кароткай «кактэйльнай» сукенцы. «Трасформеры» мяркуюць і іншыя элементы, якія можна адшпіліць, — напрыклад пышныя рукавы.



Кошт пракату шлюбнай сукенкі пачынаецца ад 270 рублёў (і да 3000), пашыў абыйдзецца ў сярэднім у 1500-2000, набыццё — ад 600 да 5000. Букет нявесты будзе каштаваць ад 60 да 500 рублёў, вэлюм — 70—300. Таксама не забываем пра прычоску, макіяж і манікюр — а гэта мінімум 200, максімум — 1000 рублёў.

У касцюм жаніха прыйдзецца ўкласці мінімум 400 рублёў (верхняя мяжа — каля пяці-шасці тысяч рублёў), хоць можна ўзяць яго напракат (ад 200). Дададзім сюды кашулю (каля 100 рублёў), туфлі, гальштук, бутаньерку (яшчэ каля 300). Часцей за ўсё жаніх выбірае класічны касцюм: двойку (штаны і пінжак) або тройку (штаны, пінжак, камізэлька). Яна можа быць як аднаго адцення з касцюмам, так і кантраснага колеру. Звычайна летам жаніхам раяць выбіраць светлы касцюм, зімой — у цёмных тонах. Калі сукенка нявесты з блакітнаватым адлівам, жаніху лепш выбраць касцюм у шэра-стальной або цёмна-сіняй гаме. Сукенка класічнага белага колеру — жаніх можа быць у класічным чорным касцюме. З сукенкай у нюдавай ружовай гаме, а таксама з колерам «шампань» добра спалучаецца касцюм жаніха ў карычневых або бронзавых адценнях.

І, вядома, галоўны сімвал свята — заручальныя пярсцёнкі. Тут кошт пачынаецца ад 110 рублёў і... губляецца ў аблоках. Дыяпазон, у якім звычайна выбіраюць гэтыя аксесуар, складае 120—1500 рублёў, распавялі супрацоўнікі ювелірнага аддзела.

### УЛАСНА СВЯТА

Застолле — галоўны артыкул фінансавых укладанняў на вяселлі. Лакацый для правядзення вяселля ў Беларусі велізарнае мноства, таму кошт вар'іруецца ў вельмі шырокіх рамках. У цэлым, пошук памяшкання варта пачынаць са складання спіса гасцей, і, зыходзячы з яго, вырашаць, як і дзе вы іх збераце. Агульнае правіла: зала павінна здавацца аднначасова поўнай і пры гэтым прасторнай, а не цеснай. Дасягаецца такі эфект, калі дзве траціны памяшкання займаюць сталы і адну траціну — месца для танцаў і зносін. У сярэднім, плануючы вечар у кафэ, сёння варта разлічваць на суму ад 60 да 300 рублёў на госця, у рэстаране — ад 100 да 500, прыкладна ў тых жа цэнавых рамках — банкет у катэджы або аграсядзібе. Гэта значыць, кошт застолля наўпрост «завязаны» на колькасці вашых гасцей.

**«Менавіта з разліку вясельнага бюджэту супрацоўнікі wedding-агенцтваў і раяць пачынаць падрыхтоўку да вяселля. Неабходна ўзяць аловак і сшытак і скласці дакладны спіс меркаваных выдаткаў. А пасля супаставіць яго з наяўнай сумай і выкрасліць тое, без чаго можна абысціся».**

Прыкладны разлік порцый — на аднаго госця па 250 г гарачага (мяса, рыба) + гарнір, па 150—200 г салаты кожнага віду, па 1 агурку, 1 памідоры. Талерка мясной нарэзкі лічыцца на траіх, як і талерка сырнага асарці. Садавіна разлічваецца гэтак жа, як агародніна: па адным фрукце кожнага віду на госця. Гарачае лепш замовіць парцыённа, перавагу можна аддаць мясу (70 %, і 30 % — рыба). Парцыённа падаюцца і гарачыя закускі. Гарніраў павінна быць не менш за два, салатаў у ідэале — не менш за тры: мясная, рыбная (або з морапрадуктамі) і «далікатэсная» (з незвычайным спалучэннем смакаў). Агародніннная салата (або агародніннaя нарэзка) будзе чацвёртая. Халодных закусак лепш выбраць не менш за тры, і яны павінны быць рознымі. Агульны падыход да выбару спіртнога — на аднаго чалавека за сталом павінна прыходзіцца па 300 мл чырвонага віна, столькі ж белага, 200 мл шампанскага і 300 г гарэлкі. На кожнага госця неабходна па 1,5 л соку, і па 0,5—1 л пітной вады, з газам і без газу. Таксама ў фінале вечара пажаданы чай.

І вось тут мы падыходзім да тэмы вясельнага торта. Падаецца ён у канцы застолля (падчас адорвання маладых), і таму выбіраць лепш не самыя каларыйныя рэцэптуры — ёгуртныя або фруктовыя, з узбітымі вяршкамі замест алейнага крэму. Вагу вясельнага торта разлічваюць так: на кожнага госця павінна прыходзіцца 150 г. У сярэднім яго кошт — ад 20 да 60 рублёў за кілаграм. Традыцыя патрабуе таксама наяўнасці вясельнага каравая (ад 8 да 20 рублёў за кіло). У многіх кандытарскіх каравай ідзе бонусам пры замове вясельнага торта.

### ДЭКОР І ПАМОЧНІКІ

І, нарэшце, вясельныя спецыялісты. Звычайна гэта вядучы (ад 500 да 3000 рублёў — у кошт можа ўваходзіць праца дыджэя, яго апаратура), фатограф, відэёграф (у абодвух выпадках — тыя ж цэнавыя рамкі). Дзве апошнія функцыі можа сумяшчаць адзін спецыяліст. Таксама, каб усё прайшло ідэальна, маладыя часта наймаюць вясельнага каардынатара. Як правіла, гэты спецыяліст бярэ 10 % ад бюджэту вяселля, затое пазбаўляе ад мноства арганізацыйных задач.

Усіх спецыялістаў, якія будуць працаваць на вашым вяселлі, лепш пазнаёміць загадзя, каб яны змаглі ўзгадніць сваю работу. Удакладніце, ці ўключае ў сябе ганарар вядучага ўвесь неабходны для правядзення вяселля рэквізіт. Калі гэта не так, будзе лепш, каб ён даў вам чэкі. З кожным са спецыялістаў лепш заключыць дагавор, дзе прапісана адказнасць у выпадку няякаснага выканання работы.

Яшчэ адзін артыкул выдаткаў — вясельны картэж. Арэнда лімузіна сёння абыдзецца маладым у 120—600 рублёў (у залежнасці ад класа аўтамабіля). Мікрааўтобус для гасцей — ад 30 да 140 рублёў. На іх упрыгожванне прыйдзецца вылучыць ад 10 да 40 рублёў за адну машыну.

У афармленне вяселля — ад дэкору залы да стварэння фотазоны, ад запрашэнняў для гасцей да падушачкі для заручальных пярсцёнкаў — таксама прыйдзецца ўкласціся: сума можа вар'іравацца, але наўрад ці складзе менш за 250—500 рублёў. Але тут як раз ёсць прастор для эканоміі: многія вясельныя аксесуары можна зрабіць сваімі рукамі. І гэты хэнд-мэйд мерапрыемства ўжо сам па сабе можа стаць маленькім святам.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Организатор торгов: ликвидатор Общества с ограниченной ответственностью «Фуд венчур»

### ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА В ФОРМЕ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Общество с ограниченной ответственностью «Фуд венчур»** |
| **Место проведения торгов** | **г. Минск, ул. Щорса, дом 1А, помещение № 19** |
| **Дата и время проведения торгов** | **15.12.2022 г. в 12.00** |
| **Срок подачи заявок** | **Не позднее 09.12.2022 г. до 17.00** |

**Предмет торгов и начальная цена**

| № лота | Наименование лота | Кол-во, шт. | Начальная цена лота, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | LE24B8000T Телевизор Haier | 1 | 300 |
| 2 | Блинница электрическая Ф1БкрЭ 380 мм, арт 21803 | 1 | 360 |
| 3 | Гриль контактный airhot cg | 1 | 250 |
| 4 | Диван «Данти» 1,4 | 18 | 4716 |
| 5 | Калькулятор настольный | 1 | 16 |
| 6 | МФУ HP LaserJet Pro M125r | 1 | 250 |
| 7 | Охладитель для молока (к кофемашине) | 1 | 280 |
| 8 | Пара кофейная, 140 мл | 15 | 75 |
| 9 | Пара чайная, 250 мл | 15 | 135 |
| 10 | Поднос столовый | 39 | 117 |
| 11 | Пресс-гриль ERGO | 1 | 285 |
| 12 | Рисоварка ERGO | 1 | 280 |
| 13 | Стул «Корд» оранжевый | 6 | 420 |
| 14 | Стул «Сигнал» коричневый | 6 | 576 |
| 15 | Стульчик для кормления | 1 | 100 |
| 16 | Тарелка для пиццы 35,5 см | 23 | 414 |
| 17 | Фритюрница ERGO | 1 | 105 |
| 18 | Фритюрница FT 4+4 | 1 | 385 |
| 19 | Чайник заварочный, 700 мл | 6 | 90 |
| 20 | Шейкер для коктейлей 593004 | 1 | 35 |
| 21 | Штора римская | 4 | 120 |

| | |
|---|---|
| **Порядок подачи заявок** | Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов либо направляются по адресу: 220052, г. Минск, а\я 17 (получатель – ИП Ржеутский А.В.), со дня выхода настоящего извещения |
| **Задаток** | Задаток в размере пяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY21OLMP30121000474500000933 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, БИК OLMPBY2X, получатель – ООО «Фуд венчур», УНП 691558147 |
| **Условия аукциона** | Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, который согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, а также победитель аукциона – претендент на покупку должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течение двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.<br>Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов, осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов.<br>Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.<br>Порядок проведения аукциона установлен Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 |

**С дополнительной информацией можно ознакомиться по тел. +375 29 667 16 72.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Узденский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

## <u>ЛОТ № 1:</u> КОРОВНИК

*(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 623/С-60614 общей площадью 1579,0 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625600000001002802 площадью 1,2111 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, 14.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, пл. 1,0208 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 48 006,72** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 800,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 25 %.*

## <u>ЛОТ № 2:</u> СИЛОСНАЯ ЯМА,

**инв. № 623/С-60613 общей площадью 354,0 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625600000001002803 площадью 0,1269 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, в районе д. Сеножатки.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 8 873,28** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **887,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 25 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 5 (пяти) процентов, по лоту № 2 – 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 14.09.2022.*

Аукцион состоится **29.11.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.11.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (01718) 68-6-73, 8 (029) 936-28-18.**

УНП 600000330

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия»**
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34)
**проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества КУП «Червенский деревообрабатывающий комбинат»**
(223232, Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71)
**в составе:**

**<u>Недвижимое имущество:</u>**

- **лесопильный цех, инв. № 615/С-15978, общей площадью 463,0 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003967 площадью 0,6739 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71;**
- **компрессорная, инв. № 615/С-16032, общей площадью 62,2 кв. м;**
- **трансформаторная подстанция № 2, инв. № 615/С-16033, общей площадью 13,6 кв. м;**
- **склад, инв. № 615/С-15977, общей площадью 403,8 кв. м;**
- **котельная** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 615/С-15983, общей площадью 504,5 кв. м;**
- **ремонтный цех** *(составные части и принадлежности: подвал, мастерская, сарай)*, **инв. № 615/С-16275, общей площадью 549,1 кв. м;**
- **здание цеха** *(составные части и принадлежности: 10 (десять) пристроек)*, **инв. № 615/С-16276, общей площадью 3531,5 кв. м;**
- **трансформаторная подстанция № 1, инв. № 615/С-15979, общей площадью 42,3 кв. м.**

Часть объектов обременена договорами аренды, сведения о которых можно получить у организатора торгов.
**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003966 площадью 1,9011 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона газораспределительной системы, пл. 0,0096 га.*

**<u>Оборудование:</u>**

- **трансформатор силовой ТМГ-400/10/0,4, инв. № 111, заводской № 1149360;**
- **ленточнопильный станок МВ-2000, инв. № 99-8;**
- **приспособление для заточки ленточных пил ПЗП-10.00.000;**
- **приспособление для разводки ленточных пил ПРП-11.00.000;**
- **рама лесопильная Р63-4Б, инв. № 120.**

**Оборудование расположено по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **265 267,01** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 65 %.*
Задаток 10 % от начальной цены – **26 526,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.** Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов, (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).</u>

*Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 12.02.2022, 22.03.2022, 16.04.2022, 07.05.2022, 22.06.2022, 30.08.2022.*

Аукцион состоится **28.11.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2022** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

